Анатоль Тарас

# 100 выдатных дзеячоў



# Мітрафан Доўнар-Запольскі

## НОВЫ ПРАЕКТ

Інстытут беларускай гісторыі і культуры сумесна з выдавецтвам «Харвест» пачаў выданне кніжнай серыі **«100 выдатных дзеячоў беларускай культуры»**

Маюцца на ўвазе тыя постаці культуры, літаратуры, мастацтва XIX–XX стагоддзяў, якія ўвасаблялі нацыянальныя погляды на гісторыю, мастацтва, культуру Бацькаўшчыны. Мэта серыі не ў тым, каб даваць падрабязныя біяграфіі, а выяўляць тое, што занеслі ў скарбніцу беларускай культуры гэтыя дзеячы, апавядаць аб іх «знакавых» здзяйсненнях. У першую чаргу брашуры прысвечаныя тым дзеячам, якія працавалі на Беларусі праз усё жыццё або значную частку жыцця. Эмігранты – як выключэнне.

Склад серыі – 100 брашур па 64 старонкі ў кожнай.

Першые тры ўжо выданыя:
«Міхал Андрыёлі» (аўтар Вітаўт Чаропка), «Фларыян Ждановіч» (аўтар Алесь Мінскі), «Мітрафан Доўнар-Запольскі» (аўтар Анатоль Тарас).

Аб'ем тэксту (на беларускай мове) – ад 30 да 50 старонак па 1800 – 1850 знакаў на кожнай старонцы.
Фота ці малюнкі абавязковы.

**Запрашаем аўтараў звяртацца са сваімі прапановамі да каардынатара і рэдактара серыі Анатоля Тараса.**

Пошта: А. Е. Тарас, а/я-137, Мінск-131
E-mail: aetaras@tut.by
Тэлефон: 8-029-653-18-55

100 выдатных дзеячоў беларускай культуры

Анатоль ТАРАС

# Мітрафан Доўнар-Запольскі

## Бацька беларускай гісторыяграфіі

Мінск
Харвест

*Серыя заснавана ў 2012 годзе*
*Заснавальнік, каардынатар і рэдактар серыі А. Я. Тарас*
*Мастацкае афармленне серыі Б. Г. Клюйка*

**Тарас А.**

Мітрафан Доўнар-Запольскі: Бацька беларускай гісторыяграфіі / А. Тарас. — Мінск : «Харвест», 2012. — 64 с. : малюнкі. — (Серыя «100 выдатных дзеячоў беларускай культуры»)

ISBN 978-985-20-0219-6

Мітрафан Доўнар-Запольскі (1867—1934) — выдатны беларускі гісторык, этнограф, эканаміст, педагог. Ён нарадзіўся ў Рэчыцы, але жыў і вучыўся, выкладаў і друкаваўся ў Кіеве і Маскве, Баку і Мінске. Доўнар-Запольскі лічыцца заснавальнікам беларускай навуковай гісторыяграфіі, у тым ліку археаграфіі і крыніцазнаўства. Аўтар класічных прац «Асновы дзяржаўнасці Беларусі» (1919), «Гісторыя Беларусі», напісанай у 1926 г., аднак убачыўшай свет толькі праз 68 гадоў, «Народная гаспадарка Беларусі, 1861—1914» (1926) і шэрагу іншых.

**ISBN 978-985-20-0219-6**

© А. Тарас, 2012
© Вокладка, Харвест, 2012

## УСТУП

Імя Мітрафана Доўнар-Запольскага ўпісана залатымі літарамі ў культуру трох народаў — беларускага, украінскага і рускага. Але, па іроніі лёсу, ні адзін з гэтых народаў не ўшанаваў свайго выдатнага дзеяча.

Доўнар-Запольскі быў «бацькам» беларускай гістарыяграфічнай канцэпцыі. Менавіта ён надаў беларускай гістарыяграфіі нацыянальную накіраванасць, пачаў асэнсоўваць гістарычныя падзеі з пункту гледжання саміх беларусаў. Ужо толькі за гэта Радзіма павінна была б ушанаваць яго памяць.

Але лёс распарадзіўся па іншаму. На доўгія гады навуковыя і публіцыстычныя творы Доўнар-Запольскага былі забытыя, а імя гісторыка аказалася фактычна выкрасленым з памяці некалькіх пакаленняў беларусаў. Іншы раз нават чуюцца пытанні: «А хто такі Доўнар-Запольскі? Што ён зрабіў?»

Даўно не перавыдаюцца яго кнігі, хоць каштоўнасць іх была прызнана і пры жыцці навукоўца, і пасля яго смерці. Імя шырока вядомага ў свой час вучонага і педагога паступова забываецца.

Таму трэба пазнаёміць сучасных беларускіх чытачоў з яго постаццю, навуковай дзейнасцю і галоўнымі творамі.

## ПЕРШЫЯ КРОКІ Ў НАВУЦЫ (1884—1889)

Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі (далей М.Д.З.) нарадзіўся 2 (14) чэрвеня 1867 г. у горадзе Рэчыца Мазырскага уезда Мінскай губерні.



*Мазыр з боку Прыпяці*

У канцы XIX стагоддзя Рэчыца мела, як сведчыць «Энциклопедический словарь Брокгауза и Ефрона», «жыхароў 9332 (4620 мужчын, 4712 жанчын), з іх 37 % праваслаўных і 59 % жыдоў. У горадзе былі 2 праваслаўныя царквы, сінагога, прыходскае вучылішча і двухкласнае яўрэйскае вучылішча.

Бацька — Віктар Мартынавіч — быў выхадцам з дробнай беларускай шляхты. Працаваў ён у той час сталаначальнікам Рэчыцкай уезднай паліцэйскай управы. Маці — Аляксандра Станіславаўна (у дзявоцтве Ліндахер) — займалася выхаваннем дзяцей, якіх, акрамя Мітрафана, было яшчэ чацвёра: Пётр, старэйшы за Мітрафана на 13 гадоў, Соф'я, Марыя і малодшая за яго Серафіма.

Сям'я ў пошуках лепшай долі вымушана пераязджала з месца на месца. Таму адукацыю Мітрафан атрымліваў у розных гарадах. Спачатку ён вучыўся ў народным вучылішчы ў Баранавічах, дзе пражывала яго сястра Соф'я, якая выйшла замуж і пераехала з мужам у гэты горад.

У 1879 годзе сям'я ад'ехала ў Балгарыю, у горад Плоўдзіў, дзе жыў старэйшы сын Пётр. Але бацька хутка пасварыўся з сынам, пасля чаго вярнуўся на радзіму, у Мазыр, забраўшы з сабою Мітрафана і пакінуўшы ў Балгарыі жонку і малодшую дачку Серафіму. З 1880 года бацька працаваў пісарам у Мазырскага міравога суддзі, а Мітрафан вучыўся ў Мазырскай прагімназіі.

У характарыстыцы на вучня VI класа прагімназіі Мітрафана Доўнар-Запольскага адзначана, што асаблівых здольнасцей да чаго б там ні было ў яго не заўважана. Адзіная выдатная адзнака у атэстаце — па закону Божаму.

Болей таго, ад класнага кіраўніка патрабавалася звяртаць на Мітрафана асаблівую ўвагу за яго саманадзейнасць і страптывы нораў.



*1-я Кіеўская гімназія*

Застаўшыся фактычна без належнай увагі з боку бацькоў, юнак пачаў сам клапаціцца пра свой лес. Ужо ў 17 год ён заявіў сябе як даследчык гісторыі роднага краю. Мітрафан пачаў вандраваць па вёсках і запісваць народныя песні, казкі, прымаўкі. Менавіта ў Мазыры ён падрыхтаваў першую нататку «Из Мозыря», змешчаную без подпісу ў газеце «Заря».

У тым жа 1884 годзе яшчэ тры нататкі пад той жа назвай былі надрукаваны у «Еженедельном обозрении». У 1885 годзе гэта выданне змясціла яшчэ пяць нататак Мітрафана.

Восенню 1885 года з-за няздачы іспыта па грэчаскай мове М.Д.З. пакінуў Мазырскую прагімназію па асабістаму жаданню і пераехаў у Кіеў, дзе жылі яго далёкія сваякі.

Але і тут узніклі праблемы. 1 красавіка 1888 г. апякун Кіеўскай вучэбнай акругі выдаў сакрэтны загад, у якім паведамлялася, што вучань VIII класа 1-й Кіеўскай гімназіі Мітрафан Доўнар-Запольскі «за предосудительное и вредное поведение, выразившееся в чтении найденных у него книг преступного содержания, по распоряжению педсовета уволен из гимназии». Дырэктару гімназіі было забаронена дапускаць Мітрафана да заняткаў у якасці вольнаслухаючага, а таксама прымаць у яго экзамены як у прыватнай асобы (экстэрнам).

Справа была ў тым, што ў канцы лютага 1888 года інспектар гімназіі знайшоў сярод кніг, якія належалі М.Д.З, некалькі выданняў, забароненых у Расійскай імперыі. Сярод іх значыліся: ліст гісторыка Мікалая Кастамарава да выдаўца «Колакала» А. Герцэна; паэма Тараса Шаўчэнкі «Марыя» з прадмовай і заўвагамі Міхаіла Драгаманава; зборнік «Грамада», які выдаваў сам Драгаманаў у Жэневе; паўднёва-рускі літаратурны даведнік «Основа» і некаторыя іншыя.

Апраўданні не дапамаглі, і ён быў выключаны з гімназіі за два месяцы да выпуска.

Восенню 1888 года М.Д.З. падаў прашэннэ аб вяртанні ў гімназію, але ў гэтым яму было адмоўлена. У лісце на імя апекуна Кіеўскай вучэбнай акругі дырэктар гімназіі пісаў аб немагчымасці змягчэння пакарання:

> …оставленный на произвол судьбы родителями Довнар-Запольский уже в бытность свою в Мозырской прогимназии успел заразиться вредными направлениями и, по-видимому, остался и в Киевской гимназии в том же настроении, иначе он не решился бы, несмотря на свою бедность, приобретать книги вредного содержания в Болгарии, а купивши, не стал бы хранить подобные книги у себя*.

Таму, па словах дырэктара, няма ўпэўненасці ў тым, што юнак не будзе займацца забароненай дзейнасцю ў іншых навучальных установах, якія не ў стане прадухіліць яго дрэнны ўплыў на іншых вучняў.

Але М.Д.З. не ўпаў духам. Звязаўшыся з рэдакцыяй газеты «Минский листок», пачаў пасылаць туды свае артыкулы па гісторыі і этнаграфіі роднага краю. Менавіта тады ў нарысе «Ад Кіева да Рагачова» («Минский листок», 1887, № 64) ён ад імя беларускага селяніна патрабаваў друкаваць літаратуру на беларускай мове.

Нягледзячы на жыццёвыя цяжкасці, 1888 год быў плённы. Ад нататак на краязнаўчыя тэмы М.Д.З. перайшоў да даследчай працы. З'явіўся яго этнаграфічны эцюд «Белорусская свадьба и свадебные песни». Газета «Виленский вестник» у 14 нумарах надру-

---

* М.Д.З. паведаміў у тлумачальнай запісцы, што набыў забароненыя кнігі ўлетку 1886 года ў Балгарыі, калі гасцяваў у маці і брата.

кавала яго «Статистические очерки Северо-Западного края».

Газета «Минский листок» змясціла кароткі гісторыка-геаграфічны нарыс «Древняя Белоруссия» (IX—XII стст.), рэцэнзію на кнігу В. Уладзімірава «Доктор Ф. Скорина, его переводы, печатные издания, язык», некалькі артыкулаў пад агульнай назвай «Белорусское прошлое». У рэцэнзіі і артыкулах М.Д.З. даказваў, што беларусы маюць ўласную багатую гісторыю і культуру, а таксама адрозніваюцца ад суседніх народаў спецыфічнымі этнічнымі асаблівасцямі.

Варта вылучыць некаторыя думкі маладога аматара навукі (тады яму быў 21 год!). Найперш, што беларуская мова не «сумесь» польскай мовы з велікарускай, а «складае, як паказалі вучоныя даследаванні, самастойную галіну славянскай мовы». Для такога часу гэта было не проста смелае, а рэвалюцыйнае сцверджанне, асабліва калі ўлічыць, што беларускай мове адмаўлялі ў праве на існаванне. Ужываць яе ў друку забараніў цар Мікалай I спецыяльным указам, беларуская мова афіцыйна называлася не інакш як «наречие».


№ 55 МИНСКІЙ ЛИСТОКЪ № 55

ОБЩЕСТВЕННО-ЛИТЕРАТУРНАЯ ГАЗЕТА


ВИЛЕНСКІЙ ВѢСТНИКЪ

ГАЗЕТА ЛИТЕРАТУРНАЯ и ПОЛИТИЧЕСКАЯ.

Гэтыя ідэі юнака-гімназіста кардынапьным чынам адрозніваліся ад панаваўшага ў 80-е гады XIX стагоддзя пункту гледжання навуковых аўтарытэтаў Расіі, што беларусы — адгалінаванне рускага народа, якія нейкі час знаходзіліся пад польскім уплывам і былі «сапсаваны» паланізацыяй. А сярод польскіх палітыкаў і навукоўцаў панавалі думкі, што беларускі народ — гэта адгалінаванне польскага і неабходна не дапусціць яго русіфікацыі.



*Мітрафан Доўнар-Запольскі*

Высновы ж, якія зрабіў М.Д.З., мелі сапраўднае рэвалюцыйнае гучанне:

> Народ, лишенный политической жизни, подавляемый внутренним гнетом, иногда на целые столетия сходящий с политической арены, как бы замирающий — такой народ, если он не потерял своего языка, этнографических особенностей и пр. — снова выдвигается на арену если не политической, то, по крайней мере, умственной и социальной жизни.

Такія словы прагучалі на Беларусі ўпершыню!

Імя Мітрафана Доўнар-Запольскага зрабілася вядомым у навуковых колах. Як вынік, у пачатку 1889 года яму дазволілі здаць экстэрнам экзамены за курс гімназіі.

Атрымаўшы атэстат, М.Д.З. вырашыў пастурацць на гісторыка-філалагічны факультэт Кіеўскага універсітэта імя святога Уладзіміра. Даведаўшыся пра тое, бацька прыслаў ліст, у якім прапанаваў сыну «не переться в университет, не имея средств капитальных», а лепей паступіць на службу. Праўда ў канцы дадаў, што не будзе нічога мець супраць, калі сын зможа вучыцца без яго дапамогі.

Мітрафан ужо прывык жыць сваім розумам і разлічваць толькі на свае сілы. Ён здаў уступныя экзамены на «выдатна» і стаў «казённакоштным» студэнтам, што вызваляла яго ад платы за вучобу. Яму была прызначана стыпендыя імя святых Кірыла і Мяфодзія.

Як казённакоштны студэнт, у адпаведнасці з існаваўшымі тады законамі, М.Д.З. абавязваўся пасля заканчэння універсітэта 6 гадоў адпрацаваць у навучальных установах міністэрства асветы.

## КІЕЎСКІ УНІВЕРСІТЭТ (1889—1895)

Кіеўскі універсітэт імя Святога Уладзіміра быў адным з буйнейшых навуковых цэнтраў тагачаснай Расійскай імперыі. У ім працавалі многія выдатныя вучоныя, у тым ліку такія гісторыкі, як Цімафей Фларынскі (1854—1919), Пятро Галубоўскі (1857—1907), Уладзімір Іконнікаў (1841—1923).

Асаблівай павагай і аўтарытэтам у Доўнар-Запольскага карыстаўся Уладзімір Баніфацыевіч Антановіч (1834—1908), у семінары якога ён займаўся*. Такі на-

* У. Б. Антановіч аўтар грунтоўных даследаванняў «О казачестве», «Об унии», «О промышленности Юго-Западного края», «О курганах» і шэрагу іншых. Яго працы па гісторыі Украіны і Беларусі склалі зборнік «Монографии по истории Западной и Юго-Западной России» (1885 г.).

вуковы выбар быў невыпадковым. Як ужо адзначана вышэй, яшчэ да паступлення ва універсітэт М.Д.З. вельмі цікавіўся гісторыяй родных мясцін, і ўвогуле беларуская тэматыка дамініравала ў яго ранніх творах.

Антановіч адыграў немалую ролю ў лёсе М.Д.З., шмат чым дапамог і аказаў рашучы ўплыў на фарміраванне поглядаў свайго любімага вучня. Менавіта ён і прыцягнуў маладога навукоўца да глыбокага даследавання гісторыі Паўночна-Заходняй Русі («Северо-Западного края»), якой сам займаўся. У прыватнасці, па заданні настаўника М.Д.З. напісаў «Нарыс па гісторыі крывіцкай і дрыгавіцкай земляў да канца XII ст.» (1891 г.), за які быў узнагароджаны залатым медалём.

У якасці галоўнай задачы ўсіх прыхільнікаў беларускага адраджэння М.Д.З. паставіў задачу пашырэн-



*Універсітэт Святога Уладзіміра ў Кіеве*

ня ведаў пра мінулае і сучаснасць Беларусь. У сваіх артыкулах ён заклікаў стварыць на Беларусі навуковае таварыства, адкрыць свой універсітэт, які стаў бы мясцовым навуковым цэнтрам, шырока вывучаць культуру і побыт беларускага народа.

М.Д.З. уважліва чытаў усё, што пісалася пра родны яму край, сачыў за развіццём поглядаў на Беларусь рускіх, польскіх, украінскіх навукоўцаў. Напрыклад, у «Виленском вестнике» (1889, № 81) ён пісаў:

> Палякі лічылі яе амаль што не Польшчаю, велікарусы — Вялікарасіяй і нават маларусы, у асобе львоўскага праф. О. Аганоўскага (у яго «Гісторыі маларускай літаратуры»), прызнавалі беларусаў амаль маларусамі.

Доўнар-Запольскі вітаў новыя этнаграфічныя працы Аляксандра Пыпіна, Петра Шэйна, Еўдакіма Раманава, Яўхіма Карскага, Мікалая Янчука, якія давалі аб'ектыўнае ўяўленне аб Беларусі і беларускім народзе, радаваўся, што вывучэннем свайго краю пачынаюць займацца самі беларусы.

> Навука беларуская слабая, яшчэ толькі ў зародку, прытым у большай частцы ўрывачная, выпадковая і раскіданая, няма агульнай ідэі, якая была б кіруючай у гэтых работах, няма ядра, каля якога маглі б грунтавацца дзеячы, нарэшце, нямала перашкаджаюць справе аднабакова-тэндэнцыйныя погляды на Беларусь, што паявіліся ў польскай і рускай літаратурах.

Але разам з тым, адзначаў ён, у працах беларускіх вучоных ёсць тое, чаго няма ў працах польскіх, рускіх і ўкраінскіх вучоных, а менавіта — у іх ёсць «сімпатычныя, любоўныя адносіны да справы і краіны, што даходзяць іншы раз да самаахвярнасці», ёсць

«аб'ектыўнасць» і «навуковы пункт погляду». Як чалавек справы, М.Д.З. узяўся за ажыццяўленне свайго ўласнага плана вывучэння гісторыі Беларусі.

Пачаць вырашыў э арганізацыі спецыяльнага выдання, прысвечанага роднаму краю. Так з'явіўся «Календарь Северо-Западного Края», які выходзіў у 1889 і 1890 гадах пад рэдакцыяй Доўнар-Запольскага і пры актыўным удзеле У. Завітневіча і М. Шахава.



*Прафесар Уладзімір Баніфацьевіч Антановіч*

Спачатку меркавалася выдаваць «Календарь...» у Кіеве. Аднак мясцовая цэнзура да гэтага пачынання аднеслася з падазронасцю, і выданне прыйшлося перанесці ў Маскву, дзе ўмовы былі больш спрыяльныя. Але і тут пісаць пра Беларусь прыходзілася хаваючыся за афіцыйную назву «Северо-Западный Край». А калі цэнзар ўбачыў, што М.Д.З. плануе змясціць у «Календаре...» аповесць Винцэнта Дуніна-Марцынкевіча «Гапон» на беларускай мове, то забараніў гэта.

Тады рэдактар пайшоў на хітрасць. Пад рубрыкай «Из истории белорусской письменности» выйшаў яго артыкул, у якім змяшчалася крытыка поглядаў польскіх вучоных і літаратараў на Беларусь як усходнюю частку Польшчы. У артыкуле разбіралася ў якасці прыкладу вершаваная аповесць «Гапон». Але разбор праводзіўся такім чынам, што тэкст аповесці быў

надрукаваны цалкам. Так чытач упершыню атрымаў магчымасць азнаёміцца з поўным варыянтам гэтага твора, напісанага Дуніным-Марцінкевічам яшчэ ў 1855 годзе.

У двух выданнях «Календаря...» быў змешчаны шэраг артыкулаў па гісторыі і этнаграфіі Беларусі, статыстычныя звесткі, беларускія песні і вершы. Беларусь паўставала ў іх як цікавы самабытны край са сваёй шматвяковай гісторыяй, культурай і моцным духоўным патэнцыялам. Дзякуючы кемлівасці і таленту выдаўцоў, «Календарь...» дайшоў да шырокай грамадскасці і адыграў значную ролю ў фарміраванні светапогляду будучых дзеячаў беларускага адраджэння.

Выданне «Календаря...» планавалася працягваць. Але не было ані грошаў на паперу і тыпаграфію, ані часу на рэдагаванне выдання, тым больш што яно выходзіла ў Маскве. Таму трэці нумар «Календаря...» так і не ўбачыў свет.

Улетку 1890—1891 гадоў М.Д.З. правёў плённыя экспедыцыі па Мінскай і Гродзенскай губернях, дзе вывучаў па даручэнні Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі фальклор і побыт мясцовых жыхароў, бо, як ён пісаў, «у вывучэнні быту народаў і заключаецца галоўны інтарэс гісторыі». У выніку гэтай экспедыцыі на старонках «Виленского вестника» (1890—1891) з'явіліся яго «Заметки из путешествия по Белоруссии», у якіх разглядаюцца важнейшыя пытанні жыцця і культуры беларускага народа.

Вучоны і грамадзянін — сын свайго народа Мітрафан Доўнар-Запольскі абараняў селяніна. Ён адзначыў, што селянін толькі з тым будзе шчыры, хто падыдзе да яго «не як «пан», а як «звычайны смяротны»:

> Безумоўна, гаварыць пра тое, што ў нашага селяніна «ёсць сэрца» ці «няма сэрца», пра што

спрачаліся польскія этнографы, на нашу думку, нават смешна. Быццам селянін у маральных адносінах не такі ж чалавек, як і ўсе мы.

У 1890—1894 гг. М.Д.З. надрукаваў некалькі дзесяткаў прац па беларускай этнаграфіі і старажытнай гісторыі. Сярод іх варта адзначыць наступныя:

«Археологические изучения Минской губернии», «Белорусская свадьба в культурно-религиозных пережитках», «Заметки по этнографии белорусов», «Из истории крестьян Белоруссии», «Крестьянские игры в Минской губернии», «Очерки по истории Белоруссии», «Первобытные формы брака», «Погребальные обряды белорусов», «Чародейство в Северо-Западном Крае в XVII—XVIII вв.».


*Яўген Ляцкі*

У сваіх рэцэнзіях студэнт смела крытыкаваў такіх вядомых даследчыкаў як Аляксандар Семянтоўскі, Павел Бранцаў, Эдуард Вольтэр, Аляксандар Весялоўскі, Уладзімір Тызенгаўзен і іншых. Усяго ў гэты час М.Д.З. надрукаваў 40 артыкулаў, нататак і рэцэнзій. Многія з іх не страцілі навуковага значэння і цяпер.

Акрамя таго студэнт Доўнар-Запольскі распачаў актыўную дзейнасць па арганізацыі беларускага навуковага гуртка са сваім уласным перыядычным выданнем.

Перш за ўсё ён заняўся пошукам людзей, якія б склалі аснову гуртка. У 1890 г. М.Д.З. пазнаёміўся з Яўгенам Ляцкім (1868—1942), будучым вядомым беларускім гісторыкам і этнографам. Ляцкі, ў той час студэнт Маскоўскага універсітэта, падтрымаў гэтую ідэю і таксама распачаў агітацыю.

У хуткім часе да гуртка далучыўся І. Багданаў, беларус па паходжанню і вялікі аматар беларускай этнаграфіі. Ляцкі зрабіў спробу прыцягнуць да супрацоўніцтва вядомага этнографа Петра Шэйна, аднак той адмовіўся нават размаўляць з ім.

У 1894 г. М.Д.З. пазнаёміўся з Я. Зіноўевым, які быў выключены з Магілёўскай гімназіі за вальнадумства і пражываў у Мінску. Зіноўеў з энтузіязмам успрыняў ідэю стварэння гуртка і беларускага перыядычнага выдання.

Так сфарміравалася аснова будучай арганізацыі беларусаў з аддзяленнямі ў Маскве (Я. Ляцкі), Мінску (Я. Зіноўеў), Кіеве (М. Доўнар-Запольскі). Зразумела, што «душой» гуртка быў М.Д.З. Ён каардынаваў дзейнасць сваіх сяброў, імкнуўся прыцягнуць да удзелу ў будучым выданні вядомых дзеячаў навукі і культуры. У 1894 годзе ён звярнуўся з прапановай аб супрацоўніцтве да паэта і перакладчыка на беларускую мову Івана Неслухоўскага (вядомага пад псеўданімам Янка Лучына). Паэт даў згоду на публікацыю сваіх твораў, аднак выказаў сумненне, што іх прапусціць цэнзура. З-за цэнзурных жа меркаванняў ён адмовіўся выступіць сузаснавальнікам новага выдання, але згадзіўся дасылаць туды свае новыя вершы, «якія зараз нікому не патрэбныя». «Мая і без таго кульгавая муза маўчыць зубы зцяўшы», — скардзіўся паэт.

Аднак гэтае выданне так і не з'явілася. Справа была не толькі ў цэнзурных перашкодах. Куды цяжэй



# ДИПЛОМЪ.

Предъявитель сего **Митрофанъ Викторовичъ Запольскій-Довнаръ**, сынъ потомственнаго дворянина, вѣроисповѣданія православнаго, по *весьма удовлетворительномъ* выдержаніи въ 1891 году полукурсоваго испытанія и по зачетѣ опредѣленнаго уставомъ числа полугодій на Историко-филологическомъ факультетѣ ИМПЕРАТОРСКАГО Университета Св. Владиміра, по историческому отдѣлу, представивъ весьма удовлетворительное сочиненіе, подвергался испытанію въ Историко-филологической Испытательной Коммиссіи при ИМПЕРАТОРСКОМЪ Университетѣ Св. Владиміра въ апрѣлѣ и маѣ мѣсяцахъ 1894 года, при чемъ оказалъ слѣдующіе успѣхи: на письменныхъ испытаніяхъ: по **русской исторіи**—*весьма удовлетворительные*; по **всеобщей исторіи**—*весьма удовлетворительные*; на устныхъ испытаніяхъ: по **греческому языку**—*весьма удовлетворительные*; по **латинскому языку**—*удовлетворительные*; по **руcской исторіи**—*весьма удовлетворительные*; по **древней исторіи**—*весьма удовлетворительные*; по **средней исторіи**—*весьма удовлетворительные*; по **новой исторіи**—*весьма удовлетворительные*; по **исторіи церкви**—*весьма удовлетворительные*; по **исторіи славянскихъ народовъ**—*весьма удовлетворительные* и по **исторіи новой философіи**—*весьма удовлетворительные*.

Посему и на основаніи ст. 81 общаго устава ИМПЕРАТОРСКИХЪ Россійскихъ Университетовъ 23 августа 1884 года, **г. Запольскій-Довнаръ** удостоенъ диплома **первой** степени со всѣми правами и преимуществами, поименованными въ ст. 92 устава и въ V п. ВЫСОЧАЙШЕ утвержденнаго въ 15-й день августа 1881 года мнѣнія Государственнаго Совѣта. Въ удостовѣреніе сего и данъ сей дипломъ **г. Запольскому-Довнару**, за надлежащею подписью и съ приложеніемъ печати Управленія Кіевскаго Учебнаго Округа. Городъ Кіевъ, іюня 17 дня 1894 года.

Попечитель Кіевскаго Учебнаго Округа
Тайный Совѣтникъ

Предсѣдатель Историко-филологической Испытательной Коммиссіи Статскій Совѣтникъ

За Правителя Канцеляріи Попечителя
Кіевскаго Учебнаго Округа

аказалася пераадолець абыякавасць і неразуменне з боку расійскай грамадскасці, у тым ліку прагрэсіўнай, а таксама з боку беларусаў. 26 студзеня 1894 года Я. Ляцкі пісаў з Масквы:

> До нашей милой Белоруссии здесь никому и дела нет. Ученые общества делают свою карьеру; журналы и газеты представляют собой по большей части акционерные общества на паях... Для общества Белоруссия некая еврейско-польская страна...

Ён адзначаў, што беларусамі сябе ў Маскве лічаць толькі некалькі чалавек, а астатнія адносяць сябе да палякаў або да рускіх. Зрабіць што-небудзь у гэтых умовах амаль што немагчыма.

Да таго ж на выданне патрэбны грошы, якіх у студэнтаў не было. Таму М.Д.З. схіліўся да думкі, што здзейсніць сваю мару яму не давядзецца. Ён адмовіўся ад прапановы Я. Зіноўева пераехаць у Мінск каб узначаліць працу па стварэнню новага выдання, а ў далейшым стаць яго галоўным рэдактарам. У лісце да Я. Ляцкага ён пісаў, што мяркуе поўнасцю акунуцца ў навуку і заняцца сваей любімай тэмай — гісторыяй Беларусі.

Калі надыйшоў час выпускных экзаменаў ва універсітэце, старшыня экзаменацыйнай камісіі прафесар Ф. Зялінскі адзначыў, што выпускнік Доўнар-Запольскі «обладает редкостным для его возраста объемом познаний, замечательным трудолюбием и выдающимися природными дарованиями». Як істотна адрозніваюцца гэтыя словы ад характарыстыкі, дадзенай Мітрафану падчас вучобы ў Мазырскай прагімназіі.

У 1894 годзе таленавіты і працалюбівы малады беларус (27 гадоў) атрымаў універсітэцкі дыплом.

Аднак у сувязі з «политической неблагонадежностью» выкладчыцкая дзейнасць у Кіеўскай вучэб-

най акрузе яму была забаронена. Прашэнне да папячыцеля Віленскай вучэбнай акругі аб прызначэнні настаўнікам рускай мовы ў Віцебскую жаночую гімназію або ў Віленскі яўрэйскі настаўніцкі інстытут, дзе меліся вакансіі, засталося без адказу. І тут зноў дапамог У. Антановіч. Ён хадайнічаў за свайго вучня і атрымаў дазвол, каб той застаўся пры кафедры рускай гісторыі Кіеўскага універсітэта.

Як вучоны, М.Д.З. прымыкаў да так званай «Западнорусской школы», у якой былі два накірункі. Правае яе крыло,— спярша Гаворскі, Каяловіч, потым Саланевіч, Пшчолка, Кулакоўскі, Бажэлка, Кавалюк і іншыя — выдавалі пры падтрымцы царскага ўрада газеты і часопісы («Вестник Западной России», «Крестьянин», «Окраина России», «Северо-Западная жизнь»), на старонках якіх даказвалі, што Беларусь — край цалкам рускі і праваслаўны.

Што ж тычыцца левага крыла, у якое ўваходзілі Мікалай Нікіфароўскі (1845—1910), Аляксей Сапуноў (1851—1924), Еўдакім Раманаў (1855—1922), Мацей Любаўскі (1860—1936), Дзмітрый Даўгяла (1868—1942) і іншыя, дык яно не мела ніякай падтрымкі з боку улад, свае працы гэтыя вучоныя выдавалі, як правіла, за свой кошт, бо спрабавалі даказаць і польскім вучоным, і некаторым «северо-западникам», што край беларускі — гэта своеасаблівы край, а беларусы — самастойнае адгалінаванне славянства.

Яны захапляліся беларусамі, якія, нягледзячы на стагоддзі ўціску як з боку польскіх паноў, так і з боку рускіх чыноўнікаў, не страцілі самабытнасці, захавалі сваю мову і культуру.

Гэтыя даследчыкі запісвалі песні і казкі, даследавалі абрады, побыт, складалі слоўнікі, імкнуліся паказаць, наколькі самастойная ў беларусаў духоўная і матэрыяльная культура, што ў беларусаў ёсць не «наречие»,

а свая мова, якая адрозніваецца і ад рускай мовы, і ад польскай. Тым самым яны заклікалі беларусаў да свайго нацыянальнага і культурнага адраджэння.

У 1895 годзе у Кіеве выйшла першая буйная кніга М.Д.З. «Белорусское Полесье». Сборник этнографических материалов, собранных М. Довнар-Запольским. Выпуск 1». Рэцэнзіі на яе далі Яўхім Карскі, Агафангел Крымскі, Яўген Ляцкі і іншыя навукоўцы.

Больш за тое, выданне гэтай кнігі ініцыявала навуковую дыскусію па пытаннях этнаграфіі палескага рэгіёна.

## МАСКВА (1895—1901)

У 1895 годзе Кіеўскі універсітэт камандзіраваў М.Д.З. у Маскоўскі архіў міністэрства юстыцыі, дзе ён павінен быў займацца аналізам матэрыялаў Метрыкі Вялікага княства Літоўскага для напісання магістарскай дысертацыі. Адначасова малады гісторык уладкаваўся на працу ў прыватную жаночую гімназію Ржэўскай.

У 1897 годзе М.Д.З. выдаў першы том «Документов Московского архива Министерства юстиции», у які ўпершыню былі ўключаны матэрыялы аб Віленскім, Гарадзенскім, Люблінскім сеймах і іншыя дакументы, якія ахоплівалі перыяд з 30-х гг. XIV стагоддзя да 1569 года. Менавіта з гэтага часу М.Д.З. пачаў сваю дзейнасць як археограф і крыніцазнаўца.

Імя Мітрафана Віктаравіча Доўнар-Запольскага станавілася ўсё больш вядомым у навуковых колах. Аўтарытэт і павагу прынеслі яму шэраг навуковых прац: «Польско-литовская уния на сеймах до 1569 г. Исторический очерк» (1897), «Берестейское староство в XVI веке» (1898), «Литовские упоминки татарским

ордам» (1898), «К истории поземельной реформы в Ливонии 1580—1582 гг.» (1899).

Вялікую навуковую каштоўнасць мелі публікацыі ім поўнага тэкста Баркулабаўскага летапісу (1898), гэтага надзвычайнага помніка беларускага сярэднявечча, а таксама «Актов литовско-русского государства. 1390—1529 гг.» (1899), дзе былі ўпершыню навукова сістэматызаваны дакументы з гісторыі ВКЛ амаль за 150 гадоў.



*Маскоўскі ўніверсітэт у 1884 годзе*

У 1899 годзе Доўнар-Запольскі паспяхова вытрымаў магістарскія іспыты і быў прыняты ў Маскоўскі універсітэт прыват-дацэнтам гісторыка-філалагічнага факультэта на кафедру расійскай гісторыі, якую ўзначальваў славуты Васіль Ключэўскі (1841—1911). Мітрафан Віктаравіч праявіў сябе як таленавіты выкладчык. Яго лекцыі заўсёды збіралі поўную аўдыторыю і былі вядомы за межамі універсітэта.

Леў Талстой, які ў 1884 годзе апублікаваў раздзелы з незакончанага рамана «Дзекабрысты», даведаўся аб

тым, што Доўнар-Запольскі ў сваіх лекцыях дакранаецца гісторыі дзекабрысцкага руху. Таму ён запрасіў М.Д.З. да сябе.

У доме Талстых у Хамоўніках адбыліся некалькі сустрэч і працяглых гутарак на гэту тэму сусветна вядомага пісьменніка з маладым гісторыкам.

Пазнаёміліся ж яны, як сведчыць «Дзённік» аўтара «Вайны і міра», значна раней і вось пры якіх акалічнасцях. З ухвалення і пры гарачай падтрымцы Л. М. Талстога яго блізкі знаёмы, супрацоўнік выдавецтва «Посредник» П. А. Буланжэ збіраўся выдаваць часопіс «Утро», рэдактарам якога згадзіўся быць Доўнар-Запольскі. Каб абмеркаваць напрамак ўсе дэталі гэтага выдання, П. А. Буланжэ 20 жніўня 1890 года з будучым рэдактарам наведаў пісьменніка,



*Дзеці М. В. Доўнар-Запольскага — Усевалад, Вячаслаў і Ірына*

пра што той пакінуў запіс у сваім «Дзённіку» («Учора быў Буланжэ з рэдактарам»). На жаль, выданне часопіса забараніў царскі ўрад.

Вынікі свайго даследвання Доўнар-Запольскі падсумаваў ў надрукаванай магістарскай дысертацыі «Государственное хозяйство Великого княжества Литовского при Ягеллонах» (1901 г.), за якую атрымаў прэмію імя П. Бацюшкава*. Увогуле ж на той момант М.Д.З. меў ужо каля 100 надрукаваных прац!

У тыя ж гады маскоўскага жыцця М.Д.З. некалькі разоў наведаў Беларусь, дзе працаваў ў бібліятэцы і архівах Храптовічаў**. Як вынік гэтых надзвычай плённых паездак у родныя мясціны з'явіліся яго працы па беларускай этнаграфіі на старонках «Этнографического обозрения».

Доўнар-Запольскага выбралі рэдактарам часопіса «Труды», які заснавала па яго ж ініцыятыве Археаграфічная камісія Імператарскага Рускага Археалагічнага таварыства. Аднак М.Д.З. не задаволіўся гэтым, а, наадварот, пашырыў сваю навуковую дзейнасць.

Маскоўскі перыяд стаў адметным і ў асабістым жыцці Доўнар-Запольскага. У 1896 годзе ён ажаніўся тутака на Надзеі Маркаўне Зейферт. Гэта быў яго другі шлюб (пра першы шлюб амаль што нічога невядома). У 1898 годзе у іх нарадзіўся сын Усевалад, у 1900 — другі сын Вячаслаў, а яшчэ праз два гады — дачка Ірына.

* Пампей Бацюшкаў (1811—1892) — расейскі дзяржаўны і грамадзскі дзеяч, гісторык, выдавец. Па палітычных поглядах быў славянафіл, па навуковых — заходнерусіст.

** Бібліятэка (больш за 10 тыс. кніг) і архіў знаходзіліся ў маёнтку Шчорсы Навагрудскага павета. У 1913 г. бібліятэку перадалі на часовае захоўванне Кіеўскаму універсітэту. У 1941 г. бібліятэку вывезлі у Саратаў і Уфу, дзе значная частка кніг знікла. Рэшткі бібліятэкі (2 тыс. кніг па перапісу 1985 г.) знаходзяцца зараз у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы АН Украіны.

## І ЗНОЎ КІЕЎ
## (1901—1918)

Усё ж Масква не вельмі вабіла Мітрафана Віктаравіча, яго сэрца цягнулася да настаўнікаў і сяброў, якія заставаліся ў Кіеве. У 1901 годзе пасля шматлікіх хадатайстваў Уладзіміра Антановіча і Міхаіла Грушэўскага міністр народнай асветы згадзіўся на перавод М.Д.З. з Маскоўскага універсітэта ў Кіеўскі. Тут ён прайшоў шлях ад прыват-дацэнта да прафесара, кіраўніка кафедры рускай гісторыі і заснавальніка ўласнай гістарычнай школы.

Кіеў стаў для яго месцам сапраўднага трыумфа. Вялікая актавая зала універсітэта не заўсёды магла змясціць усіх жадаючых паслухаць лекцыі М.Д.З. Яго вучаніца, вядомы гісторык Наталля Палонская-Васіленка (1884—1973), пісала ў сваіх успамінах:

> Доўнар-Запольскі захоўваў у дачыненні з студэнтамі паставу старэйшага, бліскучага сябра, цікавіўся справамі моладзі, дапамагаў студэнтам выходзіць на навуковы шлях, ніколі не шкадаваў часу на кансультацыі, парады, дазваляў карыстацца сваёй багатай бібліятэкай. Навогул на гістарычна-філалагічным факультэце было два выдатныя прафесары — сябры моладзі, якія мелі найбольш вучняў і дапамагалі ім у іхняй навуковай працы — гісторык Доўнар-Запольскі і філолаг і гісторык літаратуры В. Перэтц.

У 1903 годзе М.Д.З. заснаваў гісторыка-этнаграфічны гурток, членамі якога з'яўляліся студэнты і стыпендыяты* як універсітэта, так і іншых навучальных устаноў Кіева. Гэты гурток займае асобае месца

* Стыпендыятамі называліся выпускнікі універсітэтаў і іншых навучальных устаноў, якія накіроўваліся для падрыхтоўкі да выкладчыцкай і навуковай працы за дзяржаўны кошт.

сярод іншых падобных да яго навуковых аб'яднанняў. Ён існаваў амаль 11 гадоў. За гэты час праз яго прайшло каля 100 чалавек. Гісторыка-этнаграфічны гурток выдаваў «Университетские Известия» і зборнікі навуковых прац. Усяго выйшла 10 такіх зборнікаў.

Многія сябры гуртка сталі вядомымі гісторыкамі. Іх аб'ядноўваў агульны інтарэс да сацыльна-эканамічнай тэматыкі і таму іх па праву можна аднесці да школы Доўнар-Запольскага. Гэта будучуя прафесары Кіеўскага універсітэта Павел Смірноў (1882—1947), Андрэй Гневушаў (1882—1920), Яўген Сташэўскі (1884—1938), Н. Палонская-Васіленка, Васіль Базілевич (1893—1942), Барыс Курц (1885—1938), Мікалай Яніцкі (1891—1979), прафесары Украінскага вольнага універсітэта ў Мюнхене Пятро Курынны (1894—1972) і Барыс Крупніцкі (1894—1956), прэзідэнт Украінскай вольнай акадэміі навук Зміцер Дарашэнка (1882—1951) і іншыя.

У Кіеве ён адразу ж пачаў пісаць доктарскую дісертацыю «Очерки по организации западнорусского крестьянства в XVI веке», якую з поспехам абараніў у 1905 годзе. У гэтай буйнай працы на велізарным архіўным матэрыяле ён разгледзіў праблемы фарміравання беларуска-літоўскай дзяржаўнасці, сацыяльна-эканамічнае развіццё і сацыяльна-эканамічныя адносіны ў ВКЛ XIV—XVI стагоддзяў. Наваогул усе працы М.Д.З. па гісторыі вылучаліся менавіта сацыяльна-эканамічным падыходам.

Круг інтарэсаў Доўнар-Запольскага тым часам пашыраўся і пашыраўся. Разам з даследаванием гісторыі роднага краю, ён шмат увагі аддаваў вывучэнню тайных архіваў, да якіх якраз у гэтыя гады быў дазволены допуск, — яны датычылі дзекабрыстаў.

Атрымаўшы ступень прафесара, М.Д.З. стаў працаваць яшчэ больш. У 1904 годзе у першым томе «Кни-

ги для чтения по русской истории» былі надрукаваны яго артыкулы «Скифские могилы», «Борьба Руси со степью в X—XII ст.», «Вече», «Князь и княжское управление», «Дружина и боярство», «Холопы», «Церковь и духовенство», «Карта древней Руси». У іх ён праявіў сябе як таленавіты прапагандыст гістарычных ведаў.

Асобае месца сярод прац таго часу займаюць працы па гісторыі грамадска-палітычнай думкі ў Расіі, што стала сваеасаблівым водгукам навукоўца на бурныя рэвалюцыйныя падзеі і сведчыла пра яго сімпатыі да дэмакратычнага руху, які ўзмацняўся ў імперыі.

У 1905—1906 годы выйшлі з друку яго працы «Политические идеалы М.М. Сперанского» і «Из истории гражданских течений в России».

Ён падрыхтаваў і выдаў зборнік «Мемуары декабристов (Записки, письма, показания, проекты конституций, извлеченные из следственного дела, с вводной статьей)» (Кіев, 1907), які стаў першым афіцыйна дазволеным выданнем, прысвечаным гісторыі дзекабрызму, паклаў пачатак навуковага даследавання гэтай грамадзскай з'явы. Гэты зборнік, манаграфіі «Идеалы декабристов» (Москва, 1907) і «Тайное общество декабристов» (Москва, 1907) чытала наўзахапкі ўся перадавая інтэлігенцыя Расіі, а яго лекцыі пра «тайныя таварыствы» прынеслі яму небывалы поспех сярод студэнцкай моладзі.

Рос яго навуковы аўтарытэт не толькі ў Расіі, на Украіне, але і ў Беларусі. Пра гэта сведчыць факт выдання яго кнігі «Исследования и статьи» (1909 г.), у які ўвайшлі яго лепшыя працы.

Бачыць гэтыя працы сабранымі ў адной кнізе вельмі хацеў вядомы даследчык Віцебшчыны, дэпутат Дзяржаўнай думы Аляксей Сапуноў (1851—1924). Жывучы на Беларусі, Сапуноў як мала хто адчуваў на-

пружанае дыханне, крокі той «агромністай» грамады, пра якую напісаў у 1905 годзе Янка Купала ў вершы «А хто там ідзе?»

Як вядома, ні Доўнар-Запольскі, ні Сапуноў, ні некаторыя іншыя вучоныя левага крыла «западно-руссизма» не прымкнулі да таго нацыянальна-вызваленчага руху, што быў звязаны з Беларускай Сацыялістычнай Грамадой і выданнем газеты «Наша ніва». Але гэтыя вучоныя рабілі ўсё магчымае, каб гэты рух нарадзіўся, пашыраўся, аказвалі яму маральную падтрымку і дапамогу.

У зборнік М.Д.З. «Исследования и статьи» ўвайшлі каля 20 артыкулаў пра родны край — даследаванні па этнаграфіі, сацыялогіі, звычаёваму праву, статыстыцы, беларускаму пісьменству.

Каштоўнасць гэтых прац нельга перааценіць, большасць іх і цяпер чытаюцца так, быццам толькі што напісаныя. Вось назвы некаторых з іх: «Нарысы сямейнага звычаёвага права сялян Мінскай губерні», «Беларускае вяселле ў культурна-рэлігійных перажытках», «Рытуальнае значэнне каравайнага абраду ў беларусаў», «Жаночая доля ў песнях пінчукоў», «Гапон», аповесць у вершах на беларускай мове В. Дуніна-Марцінкевіча (з гісторыі беларускага пісьменства)», «Беларусы. Этнаграфічны нарыс», «Заўвагі аб беларускіх гаворках»...

У 1910 годзе М.Д.З. заснаваў у Кіеве таварыства Аматараў сацыяльных ведаў, сябрамі якога сталі выдатныя дзеячы тагачаснай навукі. Пры таварыстве ўзнікла некалькі секцый — гістарычная, педагагічная, права. Вялікая і разнастайная арганізатарская і педагагічная дзейнасць не перашкаджала навуковай працы.

Адна за другой выходзілі яго кнігі: «Материалы для истории крепостного права в России» (Киев, 1905),

«Украинские староства в первой половине XVI ст.», (Киев, 1908), «Баркулабовская летопись» (Москва, 1909), «Из истории общественных течений в России» (Киев, 1910), «Белорусское Полесье. Пинчуки», том 1 (Киев, 1911), «На заре крестьянской свободы» (Киев, 1911), «Обзор новейшей русской истории. От эпохи Павла I до декабристов», том 1 (1912 г.), «Лекции по русской истории» (1912—1913 гг.),

У 1910—1914 гг. пад яго рэдакцыяй выйшлі тры тамы «Русской истории в очерках и статьях», а таксама «Историко-культурный атлас по русской истории» Наталлі Палонскай.

М.Д.З. прымаў актыўны ўдзел у рабоце археалагічных з'ездаў і губернскіх археалагічных камісій, быў адным з аўтараў «Проекта оснований архивной реформы в России».

Значнай яго заслугай з'явілася распрацоўка комплекснай методыкі выдання архіўных матэрыялаў. Методыка змяшчала спосабы апісання, класіфікацыі першапачатковай апрацоўкі і падрыхтоўкі дакументаў да друку, а таксама прадугледжвала наданне справе публікацыі архіўных матэрыялаў планамернага характару і пастаноўку яе пад надзейны кантроль дзяржавы.

М.Д.З. пісаў:

> Вся моя научная и общественная деятельность была самым тесным образом связана с изучением архивов, архивных материалов, со спасением частных архивов, находящихся под угрозой.

* * *

Нягледзячы на поспехі, праца ў Кіеўскім універсітэце не зусім задавальняла М.Д.З. Універсітэт непасрэдна падпарадкоўваўся міністэрству асветы, якое было адметна сваім кансерватызмам, нават рэакцыйнасцю.

Вучоны шукаў новыя магчымасці для рэалізацыі сваіх навуковых і педагагічных поглядаў. У яго з'явілася ідэя аб стварэнні вышэйшай навучальнай установы з прынцыпова новай структурай і накіраванасцю адукацыі. Само жыццё патрабавала падрыхтоўкі эканамістаў-практыкаў, якія маглі б працаваць у розных галінах народнай гаспадаркі.

У 1905 годзе ён разам з іншымі дзеячамі адкрыў у Кіеве Вышэйшыя жаночыя курсы (1905), дзе атрымаў кафедру. А праз год заснаваў Вышэйшыя Камерцыйныя курсы, якія вельмі хутка былі ператвораны ў Камерцыйны інстытут (другі ў Расіі!).

Доўнар-Запольскі заняў пасаду дырэктара Інстытута. Адначасова ён кіраваў тут кафедрай гісторыі народнай гаспадаркі.

Свае педагагічныя погляды, якія і сёння маюць цікавасць, ён выклаў у артыкуле «Новый тип высшего образования» (1907 г.) і «Записке о Киевском коммерческом институте» (1909 г.).

Пазней М.Д.З. успамінаў, што пачынаць працу прыходзілася амаль з нуля. Не было ні сродкаў, ні вучэбных праграм, ні выкладчыкаў, згодных працаваць ва ўстанове новага тыпу. М.ДЗ. ўдалося дабіцца падтрымкі мясцовых гандлёва-прамысловых колаў. Гэта дало добрыя вынікі. Калі ў 1907 годзе Інстытуту належыў адзін маленькі домік, то ў 1917 годзе ён з'яўляўся ўласнікам амаль паловы квартала шматпавярховых будынкаў з добрымі аўдыторыямі, багатаю бібліятэкай і адзіным на ўсю імперыю гандлёва-прамысловым музеем.

Але галоўнае было ў творчай атмасферы, якая стварылася ў інстытуце. Паколькі ён падпарадкоўваўся не міністэрству асветы, а міністэрству прамысловасці і гандлю, супрацоўнікі якога мелі больш ліберальныя погляды, М.Д.З. дабіўся значнай самастойнасці ў вы-

значэнні прадметаў і спосабаў навучання, ды і ўвогуле ніхто надта не ўмешваўся ва ўнутранае жыццё інстытута. Акадэмік Канстанцін Астравіцянаў (1892—1969), успамінаючы час, праведзены ў Кіеўскім камерцыйным інстытуце, пісаў:

> Свободная студенческая жизнь (...) казалась жизнью в каком-то другом мире, будто из мрачного подземелья я попал на свежий воздух.

М.Д.З. чытаў у інстытуце лекцыі па эканамічнай гісторыі Расіі, а на эканамічным аддзяленні яшчэ і лекцыі па гісторыі рускага дзяржаўнага права і па новай гісторыі Расіі.

Адзначым, што курс эканамічнай гісторыі не чытаўся болей ні ў якой навучальнай установе Расій-



*Камерцыйны інстытут у Кіеве*

скай імперыі і цалкам быў распрацаваны Доўнар-Запольскім. Яго навуковыя даследаванні і матэрыялы лекцый знайшлі адлюстраванне ў такіх выданнях як «Очерк экономического строя древнейшей Руси» (1909 г.), «История руского народного хозяйства», том 1. (1911 г.). «Очередные задачи русского экспорта» (1912 г.), «Обзор истории хозяйственной жизни России» (1914 г.), «Русский вывоз и мировой рынок» (1914 г.), «Задачи экономического возрождения России. Русско-германский обмен и текстильная промышленность» (1915 г.) і іншых.

Як і раней лекцыі прафесара карысталіся надзвычайнай папулярнасцю, ён меў вялікі аўтарытэт сярод студэнтаў, ведаў многіх па прозвішчах, цікавіўся іх жыццём і бытам. Таму ў інстытуце ўдавалася пазбягаць вострых канфліктаў, у адрозненне ад іншых навучальных устаноў.

Але ў 1912 годзе абставіны змяніліся. Кіеўскаму камерцыйнаму інстытуту быў нададзены статус дзяржаўнага. Гэтага дамагаліся самі студэнты, каб пазбегнуць прызыву ў армію. Аднак разам з наданнем статуса дзяржаўнага ўводзілася 5 % квота на прыём студэнтаў-яўрэяў, што выклікала іх вялікае незадавальненне. Да гэтага яўрэі складалі больш за палову з агульнага ліку студэнтаў, а зараз многія з іх вымушаны былі пакінуць інстытут. І хаця 5 % норма ў інстытуце ніколі не вытрымлівалася і студэнтаў-яўрэяў было значна больш, Доўнар-Запольскага сталі лічыць ледзь не галоўным віноўнікам склаўшагася становішча.

Адносіны са студэнтамі рэзка пагоршыліся. Нават адбыліся выпадкі абструкцыі яго лекцый. М.Д.З. які заўсёды паважаў студэнтаў і сам карыстаўся іх павагай, вельмі цяжка перажываў гэтыя змены, хацеў нават пераехаць у Маскву. Аднавіць ранейшыя адносіны са студэнтамі яму так і не ўдалося.

## ВІХАРЫ РЭВАЛЮЦЫІ

Першая сусветная вайна, якая пачалася 1 жніўня 1914 года, перапыніла пленную навуковую і педагагічную дзейнасць Доўнар-Запольскага. Камерцыйны інстытут і Кіеўскі універсітэт, як толькі фронт наблізіўся да Кіева, пераехалі ў Саратаў. Разам з гэтымі ўстановамі вымушаны быў пераехаць у Саратаў і М.Д.З. Сям'і з сабою ён не браў, мабыць меркаваў, што пераезд гэты будзе нядоўгі. Яго жонка Надзея Маркаўна засталася ў Кіеве. У Кіеве таксама засталіся дачка і два сыны Доўнар-Запольскага — Вячаслаў і Усевалад.

На новым месцы жылося М.Д.З. нялёгка. Быў зусім неўладкаваны быт, а галоўнае — не было ніякай магчымасці займацца навукай. Тыя кнігі, што ён захапіў з сабою, ляжалі ў скрынях нераспакаваныя. Аднак М.Д.З. і тут не падаў духам, складаў розныя планы на будучае.

Так, менавіта ў Саратаве ён склаў праекты дзвюх новых навучальных устаноў — Інстытута геаграфіі і Інстытута археалогіі. Гэтыя праекты былі рэалізаваны ў 1917 годзе адразу ж пасля вяртання з Саратава ў Кіеў.

Па сваіх поглядах М.Д.З. быў перадавы чалавек, вельмі часта цярпеў за гэта ад кансерватыўных сіл. І калі вучыўся, і калі працаваў. Але ж пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 года становішча памянялася — яго раптам залічылі ў стан ворагаў. Што гэтаму пасадзейнічала?

Галоўным чынам, дырэктарства ў Камерцыйным інстытуце. Нягледзячы на тое, што Інстытут у 1912 годзе быў зарэгістраваны як дзяржаўны па патрабаванні саміх студэнтаў і некаторых выкладчыкаў, зараз у гэтым абвінавацілі Доўнар-Запольскага.

У гэты ж час ён страціў сям'ю. Яго жонка і сыны трапілі пад уплыў вядомага дзеяча партыі бальшавікоў у Кіеве Уладзіміра Затонскага (1888—1938), які пазней стаў сакратаром ЦК Кампартыі Украіны і з'явіўся адным з ініцыятараў кампаніі барацьбы з так званай «нацдэмаўшчынай». Жонка Надзея, якая ў маладыя гады была вельмі прывабная, пакінула мужа і стала жыць с Затонскім, а сыны публічна адмовіліся ад бацькі, абвінаваціўшы яго ў контррэвалюцыйнай дзейнасці. Старэйшы сын, Усевалад, займаў ужо высокае месца ў партыйнай вярхушцы Кіева, актыўнічаў і меншы, Вячаслаў.

Праўда, развязка адносін з сынамі адбылася трагічная — Вячаслаў памёр вясною 1919 года ад тыфу, а Усевалад загінуў у пачатку 1920 года недзе на тэрыторыі Беларусі падчас падаўлення антыбальшавіцкіх выступленняў. Зразумела, што Мітрафан Віктаравіч балюча перажываў распад сям'і.

Вясной 1917 года узнік канфлікт з выкладчыцкім калектывам. Пад уплывам падзей лютаўскай рэвалюцыі студэнты інстытута вылучылі патрабаванне аб дапушчэнні іх прадстаўнікоў на пасяджэнні Вучонага савета. Сярод членаў савета гэтую прапанову падтрымаў толькі Доўнар-Запольскі.

Але гэты учынак вельмі непадабаўся выкладчыкам. Праз некалькі дзён яны правялі агульны сход з адзіным пытаннем на павестцы: аб паводзінах дырэктара інстытута. Самога М.Д.З. на сход ці то «забыліся» запрасіць, ці то запрашэнне «згубілася» па дарозе. На гэтым сходзе яго абвінавацілі ў правядзенні кансерватыўнай палітыкі, у няздольнасці весці дыялог са студэнтамі і г. д. Абвінавачанні перадалі на разгляд у гарадскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Абражаны і пакрыўджаны паводзінамі сваіх калег, многія з якіх былі яму шмат чым абавязаны, М.Д.З. ў

траўні 1917 года падаў у адстаўку з пасады дырэктара інстытута.

Усе гэтыя канфлікты адбіліся на яго навуковай дзейнасці, якая значна скарацилася. За 1917 год ён надрукаваў толькі адзін артыкул «Декабрьская революция 1825 года».

## НЯХАЙ ЖЫВЕ БНР!

Весткі пра кастрычніцкія падзеі, а затым пра Усебеларускі кангрэс у снежні 1917 года у Мінску і разгон яго бальшавікамі засталі М.Д.З. ў Навачаркаску, дзе ён жыў у сваёй сястры Марыі пасля таго, як пакінуў інстытут. Застацца ў баку ад беларускай справы вучоны не мог. У пачатку 1918 года ён зноў пёрабраўся ў Кіеў і ўключыўся ў работу Беларускага вайсковага камітэта (БВК) на тэрыторыі Украіны.

Тым часам, 25 сакавіка 1918 года ў Мінску была абвешчана незалежная Беларуская Народная Рэспубліка (БНР). Паветра было насычана пафасам дзяржаўнага будаўніцтва. М.Д.З., які з 80-х гадоў XIX стагоддзя імкнуўся прабіць сцяну неразумення э боку грамадскасці ў пытанні аб нацыянальнай і гісторыка-культурнай самабытнасці беларускага народа, мог адчуць сябе па-сапраўднаму шчаслівым: стваралася першая ў беларускай гісторыі нацыянальная дзяржава. Ён ніяк не мог не адгукнуцца на гэтую падзею з усім сваім талентам вучонага і літаратара. 6 красавіка 1918 года у першым нумары газеты «Белорусское слово» (яна пачала выдавацца ў Кіеве) быў надрукаваны яго праграмны артыкул «Жребий брошен» (праз некаторы час гэты артыкул быў перадрукаваны на беларускай мове ў газеце «Вольная Беларусь», 1918, № 13).

Доўнар-Запольскі заклікаў у артыкуле:

И мы все, Белорусы, должны помнить, что теперь положение нашей Родины налагает на нас тяжелую и ответственную обязанность. Мы должны все сплотиться, мы должны напрячь все свои силы физические и культурные для того, чтобы оправдать наше право на самостоятельное существование и отстоять независимость нашей Родины. К дружной работе, браты!

Як заўсёды, аднымі заклікамі М.Д.З. не абмежаваўся. У красавіку 1918 года ён увайшоў у склад створанай урадам БНР камісіі, якой была даручана падрыхтоўчая праца па адкрыццю універсітэта на Беларусі. У склад камісіі таксама ўвашлі народны сакратар асветы ва ўрадзе БНР Аркадзь Смоліч, прафесар Яўхім Карскі, прафесар М. Масуоніс і іншыя. 8 чэрвеня быў абраны прэзідыум гэтай камісіі. Старшынёй прэзідыума стаў Доўнар-Запольскі. Свае погляды па гэтаму пытанню ён выклаў у артыкуле «Да паноў Рады Беларускае Рэчы Паспалітай. У справе адчынення універсітэтаў» (газета «Вольная Беларусь», 1918, № 29).

Падрыхтоўка да адкрыцця універсітэта ішла даволі хутка. Аўтарытэт вядомага вучонага і арганізацыйныя здольнасці Доўнар-Запольскага спрыялі таму, што ўжо ў канцы ліпеня далі згоду працаваць у беларускім універсітэце 36 прафесараў — выкладчыкаў Варшаўскага, Дзерптскага, Кіеўскага, Маскоўскага і Пецярбургскага універсітэтаў. Ураду БНР удалася атрымаць дазвол ад германскіх акупацыйных улад на іх пераезд у Мінск. Пачаліся экстранныя пошукі памяшканняў для будучай вучэбнай установы.

Адначасова М.Д.З. прымаў удзел у вырашэнні іншых, не меней складаных задач. У красавіку 1918 года яму прапанавалі ўзначаліць Беларускую Гандлёвую палату на Украіне, галоўнай задачай якой

была арганізацыя закупак хлеба і іншых харчовых прадуктаў для Беларусі. Таксама на яе ўскладаліся функцыі дыпламатычнага прадстаўніцтва БНР на Украіне. М.Д.З. з натхненнем узяўся за новую справу.

Генеральны дагавор з урадам Украіны Беларускай гандлёвай палаце заключыць не ўдалося. Але былі падпісаны некалькі пагадненняў з міністэрствам гандлю і прамысловасці УНР аб пастаўцы на Беларусь цукру і хлеба ў абмен на тавары лясной прамысловасці. Частку тавараў Гандлёвая палата паставіла неафіцыйна, пры дапамозе нелегальных беларускіх арганізацый, якія знаходзіліся ў Кіеве. Дзейнасць М.Д.З. на гэтай пасадзе знайшла адлюстраванне ў артыкуле «Гандлёвы абмен з Украінай» («Вольная Беларусь», 1918, № 24).

Воляй лёсу М.Д.З. неўзабаве апынуўся ў самай гушчы вострай палітычнай барацьбы. Справа ў тым, што Кіеў усё больш і больш прыцягваў увагу кіраўніцтва БНР. Акт незалежнасці ад 25 сакавіка 1918 года не прызналі ні савецкая Расія, ні кайзераўская Германія. Па Брэсцкаму дагавору 1918 года яны прызнавалі Беларусь неад'емнай часткай Расійскай дзяржавы. Ніякіх афіцыйных кантактаў паміж урадам БНР і бальшавіцкім урадам у Маскве не існавала.

У гэтых умовах урад БНР імкнуўся дабіцца прызнання з боку суседніх дзяржаў, у першую чаргу з боку Украіны, незалежнасць якой была прызнана па Брэсцкаму мірнаму дагавору. Да таго ж, у Кіеве ў той час працавала дэлегацыя РСФСР на чале з Хрысціянам Ракоўскім. Урад БНР паспрабаваў выкарыстаць гэтую магчымасць для наладжвання сувязей з расійскім урадам. Кіеў на нейкі час стаў адным э важнейшых цэнтраў, дзе вырашалася будучыня Беларусі.

29 мая 1918 года Аляксандар Цвікевіч і Мітрафан Доўнар-Запольскі — кіраўнікі пастаяннай дзлегацыі

З. Доунар-Запольскі.

# Асновы Дзяржаунасьці Беларусі.

Выданьне Міністэрства Беларускіх Спрау.

Городно.

1919.

[illegible]

БНР у Кіеве — звярнуліся да Х. Ракоўскага са спецыяльнай нотай, у якой гаварылася:

> ...считаем необходимым от имени правительства БНР выразить глубокую уверенность, что социалистическое правительство Социалистической Российской республики, первое в мире, утвердившее на своем красном знамени священный принцип самоопределения народов, пойдет навстречу белорусскому народу в его борьбе за свою государственную самостоятельность, за свое единство и за целостность своей земли и тем положит прочные основания дружного сожительства двух братских народов.

Аднак перспектыва раўнапраўнага суіснавання Расіі і Беларусі не цікавіла Маскву, таму ніякага адказу на гэтую ноту атрымана не было. Зайшлі ў тупік і прыватныя перагаворы э Х. Ракоўскім.

Яшчэ раней няўдачай скончыліся спробы ўрада БНР наладзіць дыялог з германскім урадам.

У гэтых умовах погляды шэрагу дзеячаў з кіраўніцтва БНР (Антона Луцкевіча, Аляксандра Цвікевіча і іншых) скіраваліся ў бок дзяржаў Антанты. У пачатку 1919 года у Парыжы адкрылася мірная канферэнцыя, якая павінна была вырашыць пытанні аб пасляваенным дзяржаўным уладкаванні Еўропы.

Спецыяльна да гэтай канферэнцыі М.Д.З. напісаў брашуру «Асновы Дзяржаўнасці Беларусі». У пачатку 1919 года яна была выдадзена ў Гародне на беларускай, англійскай, нямецкай, польскай, рускай і французскай мовах*. Міністэрства замежных спраў БНР разаслала яе ўрадам еўрапейскіх краін з галоўнай мэ-

* Да брашуры была прыкладзена карта Беларусі у яе этнічных межах, складзеная аўтарам, якую беларуская дэлегацыя прадставіла на Мірную канферэнцыю ў Парыжы.




*Карта межаў беларускага этнаса,*
*якую склаў Доўнар-Запольскі*

тай — звярнуць увагу сусветнага супольніцтва на беларускае пытанне і паказаць яму гістарычныя карані дзяржаўнай самастойнасці Беларусі.

Лідэры БНР спадзяваліся, што краіны Антанты прызнаюць незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі. Характэрна, што брашура Доўнар-Запольскага на доўгія гады была забаронена і зноў убачыла свет на Беларусі толькі ў 1990 годзе.

Доўнар-Запольскі пісаў ў гэтай брашуры:

> Часамі даводзіцца чуць як быццам вагаючыся і сумляваючыся галасы: ці можа беларускі народ стварыць сваё асобнае і ні ад кога не залежнае гаспадарства (гасударства) або, прынамсі, увайсці

ў саюз гаспадарстваў як федэрацыйная частка?.. Гэткія ваганні і сумлёўкі вынікаюць з незнаёмства людзей з роднай мінуўшчынай і з не даволі поўнай ацэнкі культурнае стойкасці беларускага народа.

Часамі такжа іншыя сумляваюцца: дый ці ж было калі нашае беларускае гаспадарства? Праўда, пад гэткім назовам яно не існавала, як не існавала ў цяперашняй форме гаспадарства: Італьянскае, Бельгійскае, Украінскае і інш. Але беларусы станавілі крэпкае збудаванае гаспадарства, зложанае з беларускіх пляменняў, так званае Літоўскае Русі, злучаных з Літоўскім княствам. І Беларусь, як зараз убачым, толькі зусім нядаўна ўтраціла сляды свае даўнейшае крэпкае і стойкае гаспадарственнасці (гасударственнасці), меўшай такія праявы развіцця, якімі мы можам толькі пахваляцца з гордасцю і павінны дабівацца аднаўлення іх.

Асновы беларускае гаспадарственнасці глыбока заложаны ў самім беларускім народзе і апіраюцца на моцных фундаментах — гістарычных, этнаграфічных, лінгвістычных і эканамічных. Яны выяўляюцца ўва ўсёй мінуўшчыне Беларусі, яны ёсць у беларусаў і цяпер, захаваны глыбока ў народных масах...

М.Д.З. паказаў гэта на фактах на працягу ўсёй гісторыі існавання беларускага народа. Вывад у яго быў наступны:

Увесь беларускі рух апошняга часу ажно да Усебеларускага з'езда ў Мінску ў снежні 1917 года сведчыць аб здольнасці да жыцця беларускае нацыянальнасці і аб крэпкай звязі яе з гаспадарственнай незалежнасцю... Народ, каторы праз колькі сот гадоў самага цяжкага гістарычнага жыцця, нягледзячы на вострую нацыянальную барацьбу і на ўціск урадам найдужэйшага на свеце гаспадарства не ўступіў

свае нацыянальнае самастойнасці — народ, меўшы праз некалькі сталеццяў сваю гаспадарственную незалежнасць — народ, каторы мае вытвараную вякамі культуру і літаратуру, свае яркія асобеннасці этнаграфіі і языка, — такі народ мае і цяпер усе правы на гаспадарственную незалежнасць.

Неаднаразова выступаў М.Д.З. з артыкуламі на гэту тэму і ў перыядычным друку. Нездарма славуты пісьменнік Максім Гарэцкі пісаў пра яго:

> У часе рэвалюцыі прафесар цвёрда стаў на грунце незалежнай гаспадарственнасці Беларусі, аб патрэбе якой таленавіта і пераканаўча даводзіў у Кіеўскай і другіх беларускіх газетах, а таксама ў асобнай брашуры «Асновы дзяржаўнасці Беларусі», надта пашыранай сярод беларусаў і перакладзенай на еўрапейскія мовы («Гісторыя беларускай літаратуры», М.-Л., 1924, с. 220—221).

Аднак кіраўніцтва Англіі, Францыі і ЗША пакінула без увагі ўсе намаганні ўрада БНР дабіцца прызнання. Урад Англіі падтрымліваў у гэты час генерала Антона Дзянікіна, які на чале «Добраахвотніцкай арміі» намагаўся аднавіць «адзіную і непадзельную» Расейскую дзяржаву. Урад Францыі падтрымліваў адраджоную Польшчу, якую бачыў на ролі «санітарнага кардона» паміж рэвалюыцыйнай Расіяй і Заходняй Еўропай. Кіруючыя колы ЗША на чале з прэзідэнтам Вудро Вільсанам зрабілі стаўку на адмірала Аляксандра Калчака, які абвясціў сябе «вярхоўным правіцелем Расіі» і падобна Дзянікіну змагаўся за «адзіную і непадзельную расейскую дзяржаву» .

Болей таго, урад Беларускай Народнай Рэспублікі хутка быў вымушаны ўвогуле пакінуць Мінск: у сувязі з рэвалюцыяй у Германіі на змену немцам, якія хаця

і не прызнавалі БНР, але і не чынілі перашкодаў яе культурна-асветніцкай дзейнасці, прыйшла Чырвоная армія. Пад пагрозай рэпрэсіяў з боку бальшавікоў многія дзеячы БНР накіраваліся ў эміграцыю. Заціхла і праца па стварэнні Беларускага універсітэта. ён быў адкрыты толькі ў 1921 годзе, але гэта адбылося ўжо без удзелу Доўнар-Запольскага.

## ХАРКАЎ — БАКУ (1919—1925)

Жыццё ў Кіеве ўсё больш ускладнялася. Мяняліся ўлады, прыходзілі то адны, то другія заваёўнікі. У снежні 1919 года, калі да Кіева набліжаліся бальшавікі, М.Д.З. пакінуў горад, паехаў у Новачаркаск, дзе жылі яго дачка Ірына і сястра, каб там прадоўжыць пачатую яшчэ ў Кіеве перапіску з дзеячамі і прафесарамі Сімферопальскага універсітэта аб адкрыцці ў Керчы філіяла універсітэта. У выніку ён атрымаў запрашэнне на кафедру гісторыі гэтага філіяла і ад'ехаў ў Керч.

Але ледзь паспеў М.Д.З. прыехаць у Керч, як туды ўвашлі часткі Чырвонай Арміі. Выгляд у яго быў зусім не пралетарскі, хутчэй «буржуйскі», таму бальшавікі арыштавалі прафесара і адправілі ў Харкаўскую Надзвычайную Камісію («ЧК»), дзе над ім хацелі правесці суд нібыта за «контррэвалюцыйную дзейнасць». Над вучоным навісла смяртэльная пагроза.

З вялікай цяжкасцю сябрам і жонцы ўдалося, пры дапамозе Затонскага, вызваліць яго з турмы і ўладкаваць выкладчыкам у Харкаўскі інстытут народнай гаспадаркі. Акрамя таго М.Д.З. стаў прафесарам Харкаўскага ўніверсітэта і кансультантам Наркамата знешняга гандлю Украінскай ССР.

Але ў Харкаве Доўнар-Запольскі адчуваў сябе неўтульна. Шмат што нагадвала яму тут пра перажытае,

пра сямейную трагедыю. Многія ведалі і пра яго актыўнае супрацоўніцтва з уладамі БНР. Таму ў пачатку 1922 года ён прыняў прапанову з Азербайджанскага універсітэта і ад'ехаў у Баку.

У Баку М.Д.З. працаваў не толькі ва універсітэце, але і ў Палітэхнічным інстытуце, займаў пасаду начальніка Упраўлення прамысловасці і гандлю Наркамата прамысловасці і гандлю Азербайджанскай ССР. Ён заснаваў тутака сельскагаспадарчы і гандлёва-прамысловы музей Азербайджана і быў яго дырэктарам.

Пасля ўсіх выпрабаванняў вучоны нарэшце зноў атрымаў магчымасць заняцца сваёй любімай справай — навуковай і выкладчыцкай дзейнасцю. За 1920—1921 гады ён не выдаў ні воднай працы, таму зараз рабіў гэта з новай энергіяй. У 1922 годзе М.Д.З. надрукаваў у Баку артыкулы «Коньюнктура мирового рынка», «Орудия сбережения», «Мировой рынок и хозяйство Германии», «НЭП и НАЛ», «Администрирование в условиях НЭПа» і іншыя.

У 1923 годзе убачылі свет брашура «Торгово-промышленные музеи» і артыкул «К вопросу о промышленном банке». Моцны характар дапамог яму пераадолець асабістыя нягоды, аднак навуковыя поспехі чаргаваліся са спадамі. У 1924 годзе ён нічога не выдаў.

М.Д.З. карыстаўся ў Баку пашанай і аўтарытэтам. Але наперадзе яго зноў чакаў круты паварот лёсу.

## МІНСК
## (1925—1926)

Беларусь, падзеленая несправядлівым Рыжскім мірам у сакавіку 1921 года на дзве часткі — Заходнюю і Усходнюю («Нас падзялілі чужынцы ліхія, чорных дарог махляры»,— пісаў Якуб Колас), залечвала раны, нанесеныя ёй імперыялістычнай і грамадзян-

скай войнамі. Калі ў Заходняй частцы, якая трапіла ў склад буржуазнай Польшчы, беларускі нацянальны рух падаўляўся, дык у савецкай частцы адбываліся працэсы нацыянальна-культурнага адраджэння.

І вось збылася даўняя мара Доўнар-Запольскага: у Мінску былі адкрыты Беларускі дзяржаўны універсітэт, Інстытут Беларускае культуры, Дзяржаўнае выдавецтва і многія іншыя нацыянальныя культурніцкія ўстановы. З 1924 года на Беларусі разгарнулася шырокая кампанія па адраджэнні нацыянальнай культуры — так званая «беларусізацыя». Патрыятычна настроеная інтэлігенцыя паверыла бальшавікам і пацягнулася з эміграцыі на Радзіму. Пачалі вяртацца вядомыя навукоўцы, літаратары, музыканты. Найбольш вядомых з іх запрашалі персанальна.

Атрымаў такое запрашэнне і М.Д.З. ад Беларускага дзяржаўнага універсітэта і Інстытута беларускай культуры. Перад ім паўстала пытанне: застацца ў Баку, дзе ён карыстаўся вялікай пашанай і аўтарытэтам, ці ехаць у Мінск, дзе яшчэ невядома як складзецца жыццё. Але спадар Мітрафан не мог быць у баку ад свайго народа ў гэтую пераломную хвіліну яго гісторыі. Летам 1925 года ён пакінуў Азербайджан.

Гэта быў мужны крок: яго, аднесенага да ліку «контррэвалюцыянераў», аднаго з актыўнейшых дзеячаў нацыянальнага руху на Беларусі, маглі чакаць не толькі лаўры.

Ніхто не ведае, якія думы напаўнялі яго сівую галаву пад стук колаў спецыяльна дасланага за ім вагона на шляху з Баку ў Мінск. Што адчуваў ён: страх перад будучыняй альбо радаваўся прызнанню сваіх заслуг перад Бацькаўшчынай? А можа ўспамінаў, як яшчэ юнаком пачаў даказваць права беларусаў «людзьмі звацца"? Што мог адчуваць чалавек, які лепшыя свае гады аддаў таму, каб яго непісьменны, эканамічна і

рэлігійна прыгнечаны народ змог падняцца да нармальнага чалавечага жыцця?

Дзеля гэтай справы ён ніколі не шкадаваў сябе, пакутаваў ад неразумення і падазронасці, ледзь не загінуў у ЧК і вось зараз вяртаецца на Бацькаўшчыну, каб у першым на Беларусі універсітэце чытаць малапісьменным рабочым і сялянскім юнакам і дзяўчатам лекцыі па роднай гісторыі.

Мінскі перыяд жыцця і дзейнасці Доўнар-Запольскага — вельмі цікавая і пленная старонка яго біяграфіі. Хоць перыяд гэты цягнуўся ўсяго якіх паўтара года, аднак за гэты час нястомны руплівец зрабіў для свайго народа вельмі многае.

Прыехаўшы ў Мінск, М.Д.З. заняў пасады прафесара кафедры гісторыі Беларусі на педагагічным фа-



*Будынак Інстытута Беларускай культуры (Інбелкульт)*

культэце і прафесара кафедры народнай гаспадаркі Расіі на факультэце права і гаспадаркі БДУ.

Адначасова яго прызначылі сябрам эканамічнай секцыі Дзяржплана, а з 24 верасня 1925 года ён ўзначаліў створаны пры Дзяржплане рэдакцыйна-выдавецкі аддзел. Аддзелу падпарадкоўвалася выданне часопіса «Советское строительство», які праз некаторы час, пры ўдзеле М.Д.З., быў перанайменаваны ў «Сацыялістычнае будаўніцтва» і пачаў выходзіць на беларускай мове. Акрамя таго аддзел выдаваў бюлетэнь Дзяржплана, а таксама штотыднёвік «Народное хозяйство БССР», першы нумар якога выйшаў у пачатку 1926 г. пад рэдакцыяй Доўнар-Запольскага.

Таксама Доўнар-Запольскага абралі правадзейным сябрам Інбелкульта, дзе ён з 1 жніўня 1925 года ўзначаліў Гісторыка-археалагічную камісію. Камісія аб'яднала лепшыя сілы тагачаснай беларускай гістарычнай навукі, у яе склад увайшлі такія вядомыя вучоныя, як Уладзімір Пічэта, Зміцер Даўгяла, Васіль Дружчыц, Міхаіл Мялешка, Ісак Сербаў і іншыя. Камісіі паставілі задачу «падрыхтоўкі да выдання гістарычных дакументаў і актаў, распрацоўкі паасобных тэм гісторыі Беларуси яе эканомікі і культуры, а таксама апрацоўкі і публікацыі вынікаў археалагічнага даследавання Беларусі».

Пад непасрэдным кіраўніцтвам М.Д.З. было праведзена 27 пасяджэнняў камісіі. Быў падрыхтаваны да друку першы том зборніка дакументаў серыі «Беларускі архіў» — першае археаграфічнае выданне на Беларусі ў савецкі перыяд. Значная частка дакументаў, змешчаных у зборніку, друкавалася па копіях, якія зрабіў М.Д.З. яшчэ да рэвалюцыі ў архівах Масквы, Пецярбурга, Кракава і Варшавы.

17—18 студзеня 1926 года адбыўся Першы з'езд даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі, у якім



*Будынак Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 1920-е гг.*

прынялі ўдзел вучоныя з Беларусі, Расіі, Украіны. Пастанову гэтага з'езда, разам з пратаколамі і дакладамі Інбелкульт адразу выдаў асобнай кнігаю пад назваю: «Матэр'ялы да гісторыі і археалогіі Беларусі», сшытак I. Галоўнае значэнне з'езда было ў тым, што на ім былі выяўлены сілы беларускіх вучоных і тыя рукапісныя крыніцы па беларускай гісторыі, якія знаходзіліся за межамі БССР.

Былі падрыхтаваны да друку першыя выпускі «Беларускага Архіва», «Навуковы зборнік Гісторыка-Археалагічнай Камісіі», у якія ўвайшлі матэрыялы з мінскіх, варшаўскіх, маскоўскіх і магілёўскіх архіваў. Была створана асобная падкамісія па вывучэнні «старога Менску», арганізаваны навуковыя камандзіроўкі супрацоўнікаў Інбелкульта ў Кіеў, Адэсу, Маскву і ў іншыя гарады з мэтай пошукаў архіўных матэрыялаў, якія меліся ў тамашніх кнігасховішчах і датычылі гісторыі Беларусь.

Камісія правяла экспедыцыі і раскопкі на Банцараўскім гарадзішчы (Міншчына), у Заслаўі, каля

вёскі Стары Дзедзін (Калінінская акруга), даследавала мікралітычныя стаянкі па рацэ Сож каля яе ўтоку ў Дняпро, курганы каля Новага Быхава, старажытныя пячоры ў Оршы і г. д. Было выяўлена многа каштоўнага, што датычыла вывучэння даславянскай і славянскай культуры. Камісія склала археалагічныя карты Мінскай і Калінінскай акруг, а таксама ваколіц Мінска.

Дзякуючы камісіі было спынена руйнаванне помнікаў старажытнай Беларусі, некаторыя з іх узяты пад дзяржаўную ахову. Камісія адшукала неацэнны крыж Ефрасінні Полацкай, сабрала звесткі, неабходныя для складання гісторыка-археалагічнай карты Беларусі, распрацавала планы рэстаўрацыі і аховы Менскага замчышча і Полацкіх старажытнасцей.

Некалькі вельмі цікавых і карысных экспедыцый было праведзена і па вывучэнні этнаграфіі — у Быхаўскі раён (экспедыцыя І. Сербава), у Слуцкі раён (экспедыцыя А. Сержпутоўскага) і іншыя. Была напісана, абмеркавана на Камісіі і потым змешчана ў друку вялікая колькасць даследаванняў на самыя розныя тэмы мінулага і сучаснага Беларусі. Невыпадкова ў выдадзеным у 1926 годзе зборніку артыкулаў Інбелкульта «Гісторыя ўзнікнення, сучасная структура, навукова-даследчая дзейнасць», было адзначана:

> Больш энергічна і больш сістэматычна Этнаграфічная секцыя пачала працаваць з пачаткам 1926 г., калі на чале яе стаў Прэзідыум у складзе праф. М. Доўнар-Запольскага, нам. старшыні Г. Аляксандрава і сакратара І. Сербава (с. 49—50).

Мінскі перыяд у дзейнасці М.Д.З. пазначаны таксама новымі навуковымі працамі — «Цэнтралізацыя ці федэрацыя», якая была надрукавана ў часопісе «Полымя» (1925, № 8) і «Народная гаспадарка Беларусі».

Скарыстаўшы паўнамоцтвы старшыні гісторыка-археаграфічнай камісіі, вучоны паставіў пытанне аб вяртанні на Радзіму архіўных матэрыялаў, якія тым ці іншым чынам апынуліся па-за яе межамі.

Пастановай Наркамата асветы ад 9 кастрычніка 1925 года дзеля выяўлення беларускіх архіўных матэрыялаў, якія знаходзіліся ў архівах РСФСР, была створана камісія на чале са Зміцерам Жылуновічам (Цішкай Гартным) і Мітрафанам Доўнар-Запольскім. Камісія правяла вялікую працу, і ўжо 3 лістапада 1925 года М.Д.З. выступіў ад яе імя на пасяджэнні Прэзідыума Інбелкульта з дакладам па справе аб перадачы Беларусі яе архіўных матэрыялаў. Да даклада быў прыкладзены спіс архіўных фондаў, якія камісія прапанавала перавезці ў Беларусь.

На гэтым же пасяджэнні М.Д.З. выступіў з іншым дакладам — аб неабходнасці пачаць выданне Літоўскай метрыкі. У прыватнасці, ён сказаў тады:

> Літоўская Метрыка — найбагацейшая крыніца гістарычных ведаў аб мінулым Беларусі. Крыніца гэта ўваскрашае перад намі багатую культуру старой Беларусі, яе прававыя падставы, яе сацыяльную і эканамічную структуру. (...) Архіўны матэрыял велізарнай гістарычнай і нацыянальнай каштоўнасці павінен адслужыць сваю службу перад працоўным народам.

Ён заявіў, што сябры гісторыка-археаграфічнай камісіі гатовы падрыхтаваць гэтыя матэрыялы да друку без ганарара і дзяржаве неабходна аплаціць толькі выдаткі на друкаванне. Прэзідыум вырашыў звярнуцца ў СНК аб выдзяленні сродкаў на выданне Літоўскай метрыкі*.

* Але гэты зварот нічога не даў. На Беларусі з 600 тамоў Літоўскай метрыкі выданы за 86 гадоў толькі 7, тады як у Летуве — 22.

Праца на радзіме акрыляла ўжо немаладога вучонага (М.Д.З. было 58 гадоў). У другой палове 1925 года ў часопісе «Полымя», газетах «Звязда» і «Савецкая Беларусь» з'явіліся яго артыкулы «Федэрацыя ці цэнтралізацыя. Нарыс з галіны ідэолёгіі дэкабрыстых», «Гісторыка-археалагічная праца», «Літоўская метрыка», «Пытанне аб беларускай мове ў эпоху Скарыны».

Гэта была першая нізка навуковых твораў, выдадзеных ім на роднай мове.

Як сказана вышэй, 17—18 студзеня 1926 года у Мінску пад старшынствам М.Д.З. прайшоў Першы з'езд даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі. Навуковец зрабіў на ім два паведамленні: «Аб беларускіх архіўных фондах, якія знаходзяцца за межамі СССР» і «Аб беларускіх архіўных фондах, якія знаходзяцца ў РСФСР». Ён прапанаваў неадкладна пачаць перагаворы аб вяртанні гэтых фондаў у БССР.

Па дакладах з'езд прыняў спецыяльную рэзалюцыю, у якой звярнуўся да ўрада Беларусі з просьбай аб аказанні дапамогі ў справе вяртання беларускіх архіваў. Аднак ніякіх вынікаў гэты зварот не даў.

Нягледзячы на шматлікія адміністрацыйныя абавязкі, М.Д.З. многа займаўся навукай. У рэдагуемым ім часопісе «Сацыялістычнае будаўніцтва» у 1926 годзе былі надрукаваны некалькі яго артыкулаў на гаспадарчыя тэмы. У тым жа годзе выйшла яго манаграфія «Народное хозяйство Белоруссии. 1861—1914». Вядомы гісторык Уладзімір Пічэта даў станоўчую ацэнку гэтай фундаментальнай працы.

* * *

Аднак прыжыцца ў Мінску Доўнар-Запольскі не змог. Занадта самастойны ён быў у сваіх поглядах, занадта смелы ў планах беларускага дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Бальшавіцкія ідэолагі убачылі ў Доўнар-Запольскім небяспеку.

У Мінску ён скончыў працу над «Историей Белоруссии» — галоўным творам свайго жыцця. Гэтае грунтоўнае даследванне ахоплівае перыяд ад першабытнасці да станаўлення савецкага ладу. Па маштабу і глыбіні вывучэння праблем беларускага мінулага яму ў той час не было роўных.

У сакавіку 1926 года машынапісны варыянт кнігі быў прадстаўлены для абмеркавання на бюро ЦК КПБ(б). Да яго прыкладзена адмоўная рэцэнзія кіраўніка Гістпарта* і адначасова наместніка загадчыка аддзела друку ЦК Віталя Сербенты (1895—1980). Ён адзначаў, што кніга з'яўляецца ні чым іншым як

> ...более или менее последовательно оформленной и обоснованной экономическпм фактором точкой зрения национал-демократизма, во-первых, и, во-вторых, ложным освещением исторических фактов и своего рода издевательством над практическим проведением диктатуры пролетариата и советской властью.

Што ж так уразіла Сербенту ў гэтым творы? А тое, што М.Д.З., як сумленны навуковец, не пажадаў уціснуць навуковы аналіз у стандартны набор ідэалагічных догмаў, асмеліўся грунтоўна адстойваць свае погляды і прэтэндаваць на аб'ектыўнае адлюстраванне гістарычнага працэсу.

М.Д.З. разглядаў Беларусь як дзяржаву пераважна сялянскую, са слаба развітай прамысловасцю і, як вынік, — з малой колькасцю пралетарыята. Таму асноўным рэвалюцыйным элементам тутака было сялянства, якое стала крыніцай для працоўнага насельніцтва горада і рэвалюцыйнай Чырвонай арміі. Аднаго гэтага хапала,

* Гістпарт — скарочаны назоў Камісіі для збору і вывучэння матэрыялаў па гісторыі КП(б)Б і рэвалюцыйнага руху, створаная 10 чэрвеня 1921 г.

## Змест кнігі «История Белоруссии»*

Глава I. Древнейшие обитатели Белоруссии
Глава II. Образование и строй древних княжений
Глава III. Образование Литовско-Русского государства
Глава IV. Государственное устройство
Глава V. Отношение к Польше и унии 1569 г.
Глава VI. Социальный строй
Глава VII. Земская реформа и последующее развитие конституции
Глава XI. Структура народного хозяйства 16—18 вв.
Глава XII. Период разделов
Глава XIII. Устройство Белоруссии в начальную эпоху русского владычества
Глава XIV. Культура и просвещение в период деятельности Виленского университета
Глава XV. Общий обзор русской политики
Глава XVI. Народное хозяйство и роль в нем крестьянства
Глава XVII. Белорусская народность и ее культура до эпохи национального возрождения
Глава XVIII. Научное изучение Белоруссии с 60-х годов
Глава XIX. Очерк народного хозяйства последнего пятидесятилетия
Глава XX. Национальное направление периода подготовки к Возрождению
Глава XXI. Литература эпохи Возрождения
Глава XXII. Революционное и рабочее движение
Глава XXIII. Борьба за государственность

* Кніга друкавалась по машынапісных копіях. Главы VIII—X у гэтых копіях атсутнічалі. — *Рэд.*

каб прызнаць кнігу крамольнай. А калі дадаць крытыку М.Д.З. разгона бальшавікамі Усебеларускага з'езда ў снежні 1917 г., станоўчую ацэнку дзейнасці некаторых кіраўнікоў БНР і іншыя «ложные трактовки», то не варта здіўляцца той ацэнцы, якую атрымала кніга з боку галоўнага партыйнага гісторыка Беларусі.

Неўзабаве «История Белоруссии» разам з «Географией Белоруссии» Аркадзя Смоліча былі асуджаны ў закрытым дакладзе Гесэна «Аб культурным будаўніцтве», а таксама ў сакрэтным лісце ЦК КП(б) у ЦК ВКП(б). Кніга забаранілі да друку і амаль на 70 гадоў схавалі яе рукапіс ў спецфондах партыйнага архіва.

Адначасова партыйныя чыноўнікі прынялі сакрэтную пастанову аб «неабходнасці» ад'езда Доўнара-Запольскага за межы Беларусі. Ніякай магчымасці для працы ў Мінску яму не заставілі. У пачатку верасня 1926 года ён ад'ехаў у Маскву, пакінуўшы ў дар Інбелкульту большую частку сваёй вялікай бібліятэкі, якую збіраў праз усё жыццё — 11 тысяч тамоў.



*М. В. Доўнар-Запольскі сярод супрацоўнікаў Інбелкульта*

## ЗНОЎ МАСКВА
## (1926—1934)

Масква стала для М.ДЗ. прытулкам, дзе можна было больш-меньш спакойна сябе адчуваць і займацца любімай справай.

Ён працаваў у Сельскагаспадарчай акадэміі імя К. А. Ціміразева (выкладаў тут курс эканамічнай геаграфіі), ў Інстытуце народнай гаспадаркі імя Г. В. Пляханава (выкладаў курс гісторыі гандлю), стаў правадзейным сябрам Інстытута гісторыі Акадэміі Навук СССР.

Вядома ж, займаўся навукай, шмат пісаў. Але друкаваўся мала. Не падыходзілі яго працы да друку артадаксальным марксістам, што ў гэты час запаланілі ўжо навуку і выдавецтвы. Ён быў вучоны дарэвалюцыйнай школы, не ўсё, як тады некаторым здавалася, разумеў у новым жыцці. Яму не верылі, як і большасці іншых навукоўцаў дарэвалюцыйнай фармацыі.

У 1927 годзе у пятым томе «Большой Советской Энциклопедии» выйшла з друку апошняя яго значная праца «Экономический очерк БССР. Сельское хозяйство, промышленность, торговля». Тады ж быў надрукаваны падрыхтаваны раней артыкул «Социально-экономическая структура Литовско-Белорусского государства в XVI—XVII вв.» У 1928 годзе з'явілася праца «Заходні раён», што змешчана як асобны раздзел у падручніку «Экономическая география СССР» пад рэдакцыяй М. Вольфа і Г. Мегуса (Масква, 1928 г.).

* * *

Праз два с паловай гады пасля ад'езда М.Д.З. з Мінску, 3 красавіка 1929 года у Акадэміі навук Беларусі адбылося ўрачыстае пасяджэнне секцыі гісторыі, прысвечанае 45-годдзю яго навуковай дзейнасці. Тады ж на пасяджэнні Бюро ЦК КПБ(б) разглядалася пра-

панова Усевалада Ігнатоўскага аб выбранні Доўнар-Запольскага акадэмікам АН БССР. Зразумела, што партыйнае кіраўніцтва рэспублікі гэтую прапанову не падтрымала.



*Доўнар-Запольскі з жонкай Надзеяй Маркаўнай (1926 г.)*

У тым жа 1929 годзе прэзідыум Украінскай Акадэміі навук таксама хацеў паставіць кандыдатуру Доўнар-Запольскага на выбранне ганаровым сябрам сваей Акадэміі. Але і кіеўскія партыйныя чыноўнікі «параілі» сваім акадэмікам не рабіць гэтага.

У 1930 годзе імя Доўнар-Запольскага упаміналася ў так званай «акадэмічнай справе Платонава — Тарле»*. З такой нагоды Інстытута гісторыі было заблакіравана выбранне М.Д.З. правадзейным сябрам Акадэміі Навук СССР.

---

* Па гэтай справе, сфальшаванай ДПУ у 1930 годзе, былі арыштаваны, абвінавачаны у антысавецкай дзейнасці і сасланы найбольш выдатныя расейскія гісторыкі, атрымаўшыя вядомасць яшчэ да рэвалюцыі. Сярод іх М. Любаўскі, М. Ліхачоў, С. Раждзественскі, А. Якаўлеў, Ю. Гацье, Зм. Ягораў, У. Пічэта, С. Бахрушын, Б. Грэкаў, А. Андрэяў і шэраг іншых. Кіраўнікамі «антысавецкай змовы» следчыя выстаўлялі Сяргея Платонава і Яўгена Тарле — адсюль назва.

Улетку таго года на Беларусі сфальшаванай справай «Саюза вызвалення Беларусі» пачаўся пагром так званых «нацыянал-дэмакратаў», а на самой справе — лепшых нацыянальных кадраў, сапраўдных патрыётаў Бацькаўшчыны.

З гэтай нагоды вульгарызатар і граміла беларускай культуры, «партыйны філосаф» Сямен Вальфсон выступіў з абвінавачваннямі на адрас Доўнар-Запольскага. Называючы яго «ідэёвым бацькам» нацдэмаў (зборнік артыкулаў «Навука» на службе нацдэмаўскай контррэвалюцыі», Мінск, 1932, с. 72) Вальфсон пісаў:

> Найбольш яскравым прыкладам таго, як дзівосна злучаюцца і ўжываюцца часамі нават у адной асобе расійскі і беларускі шавінізм, можа служыць фігура Доўнар-Запольскага, аб якім можна сказаць словамі Фаўста, што дзве душы жывуць у яго грудзях. Пры гэтым нават цяжка сказаць, якая з душ Доўнар-Запольскага сапраўдная, нутраная: вялікадзяржаўная ці нацдэмаўская. Настолькі трывала ў гэтым прафесару амальгама дзвюх надворна-процілеглых, але па сутнасці справы глыбока родных адна другой, аб'яднаных адзінаю класаваю прыродаю, нацыяналістычных ідэалогій. (Тамсама, с. 84).

А вось што напісаў у тым жа зборніку іншы пільны крытык, нейкі Р. Выдра:

> Само сабою зразумела, што нацдэмы, аддаўшы так многа ўвагі «гісторыі і археалогіі», паклапаціліся таксама і аб тым, каб даць для «археолёгагістарычных» даследаванняў адпаведную ўстаноўку і мэтадалогію. З гэтаю мэтаю яны мабілізавалі «лепшыя» свае сілы на з'ездах, на акруговых канферэнцыях, у «Нашым краі», дзе ў радзе вусных і

друкаваных выступленняў разгарнулі ва ўсю шырыню сваю «археолёга-гістарычную», спецыяльна да краязнаўства прыстасаваную праграму. Тутака мы ізноў сустракаемся з Мялешкаю, на дапамогу яму спяшаецца Даўгяла, Доўнар-Запольскі...

Ужо на I Усебеларускім краязнаўчым з'ездзе Доўнар-Запольскі выступае з дакладам: «Краязнаўчая работа ў галіне гісторыі і археалогіі». Асноўная думка, так сказаць, квінтэсэнцыя даклада, выражана дакладчыкам вельмі рэльефна:

«Вывучэнне курганоў і „гарадзішчаў“ мае нацыянальны змест. Ёсць тэорыя, якая шукае на тэрыторыі Беларусі літоўскія курганы і паселішчы (стаянкі). Вось выяснением формы гэтых помнікаў мы павінны разбурыць гэтую тэорыю».

Як бачым, устаноўка зусім зразумелая. Вывучэнне курганоў мае... нацыянальны змест... У кароткай і сціслай форме Доўнар-Запольскі, гэты вялікадзяржаўны шавініст, паступіўшы на службу да беларускіх нацдэмаў, дае зразумець: вывучайце курганы, тамака знойдзеце карэнні беларусаў, тамака знойдзеце ўсе спецыфічныя нацыянальныя рысы і ўласцівасці.

Мабілізуйце курганы і гарадзішчы ў якасці зброі супроць тых, хто асмельваецца адмаўляць самабытнасць і выключнасць беларусоў... («Навука» на службе нацдэмаўскай контррэвалюцыі», Мінск, 1931, с. 289—290).

Крыху пазней «партыйны» беларускі гісторык Васіль Шчарбакоў яднаў імёны Доўнар-Запольскага, Сапунова і іншых вучоных левага крыла «западнорусcизма» з імёнамі кіраўнікоў нацыянальна-вызваленчага руху Ластоўскім, Цвікевічам, Ігнатоўскім.

Ён плявузгаў:

Ужо ў 1910 г. у Вільні выйшла першая кніжка вядомага контррэвалюцыянера Ластоўскага — «Кароткая гісторыя Беларусі». Некалькі пазней, у 1917 г., пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў 1918 г. і ў пазнейшыя часы следам за Ластоўскім выступае цэлы рад другіх беларускіх гісторыкаў-нацыяналістаў, гісторыкаў нацыянал-дэмакратаў. Самымі віднейшымі контррэвалюцыйнымі гісторыкамі нацыянал-дэмакратамі былі: Ластоўскі, Доўнар-Запольскі — былы гісторык вялікадзяржаўнік, Цвікевіч, Ігнатоўскі, Турук і цэлы рад іншых іх вучняў...

Беларускія гісторыкі нацыянал-дэмакраты ідэалізавалі далёкае мінулае Беларусі, паказваючы яго як самыя шчаслівыя часы, як ідэал жыцця. Рабілі яны гэта зноў толькі для таго, каб падкрэсліць, што цяперашняя ўлада і цяперашнія парадкі, г. зн. савецкая ўлада, дыктатура пралетарыяту, не падыходзяць быццам для цяперашняга насельніцтва. Гэтыя гісторыкі паказвалі ў лепшых фарбах, ідэалізавалі дробнабуржуазныя нацыяналістычныя беларускія партыі, напрыклад, такую, як БСГ, ідэалізавалі буржуазную беларускую інтэлігенцыю, герояў беларускага шляхецтва накшталт Кастуся Каліноўскага...

І недарма амаль усе гэтыя гісторыкі з'яўляліся членамі контррэвалюцыйнай арганізацыі беларускіх нацыянал-дэмакратаў, раскрытай у нас у 1930 і ў 1931 гг. Гэтыя арганізацыі былі звязаны з усімі нацыянал-фашыстамі, правакатарамі і шпіёнамі, якія былі і ёсць цяпер за межамі, і разам з рэшткамі варожых нам элементаў унутры БССР вялі барацьбу супроць БССР, падрыхтавалі інтэрвенцыю у яе. Недарма яны ўстанавілі змову супроць савецкай улады, з'яўляючыся агентамі, шпіёнамі і правакатарамі

польскіх, нямецкіх і іншых краін імперыялістаў, фашыстаў, рука аб руку працуючых з нацыянал-фашыстамі Заходняй Беларусі.

Характэрна адзначыць, што беларускія гісторыкі нацыянал-дэмакраты пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі працавалі рука аб руку з рускімі буржуазнымі гісторыкамі-вялікадзяржаўнікамі... Звярыная нянавісць і тых і другіх да савецкай улады і пралетарскай рэвалюцыі згуртоўвала іх у адзін лагер контррэвалюцыйных гісторыкаў. І недарма рад былых гісторыкаў-вялікадзяржаўнікаў, папаўшых да нас ў Савецкую Беларусь пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, перайшлі на службу да нацыянал-дэмакратаў.

Такімі гісторыкамі з'яўляюцца: Доўнар-Запольскі, Пічэта. Гісторыкі нацыянал-дэмакраты хвалілі, працягвалі рукі гісторыкам-вялікадзяржаўнікам, напрыклад, Карскаму, таму ж Любаўскаму. А. Цвікевіч гісторыкаў-чарнасоценцаў, судзеячаў Мураўёва-вешацеля, паказваў нават як заснавацеляў беларускага нацыянальна-культурнага руху.

Работы ўсіх гэтых варожых нам гісторыкаў мы павінны адкінуць.

(Шчарбакоў В. К. «Нарыс гісторыі Беларусі», ч. 1, Мінск, 1934, с. 13—15).

Вальфсон, Выдра і Шчарбакоў рабілі тое, што падабалася вышэйшым партыйным функцыянерам. Яны хлусілі, фарбавалі ў чорны колер найвыдатнейшых суайчыннікаў, да якіх ім самім было далёка як да сонца.

Бо той жа, як яго называў Шчарбакоў, «гісторык-чарнасоценец», «вялікадзяржаўнік» А.П. Сапуноў, напрыклад, будучы дэпутатам Дзяржаўнай думы, куды яго выбралі дзякуючы настаўнікам, знайшоў у сабе

мужнасці не пагадзіцца з Сталыпіным, які 27 красавіка 1911 года з трыбуны 3-й Думы заявіў: «Заходні край ёсць і будзе краем рускім назаўсёды, навекі». Вось што адказаў яму «чарнасоценец», «вялікадзяржаўнік» Сапуноў:

> Усе, нават самыя малыя народнасці, імкнуцца цяпер да самавызначэння; за імі ўсе прызнаюць права на гэта. Толькі адна народнасць, народнасць беларуская, не смее думаць пра гэта.

Ён жа, той самы «чарнасоценец» і «вялікадзяржаўнік» Сапуноў у сваім рэфераце «Белоруссия и белорусы», прачытаным у Віцебскай Архіўнай Камісіі 26 кастрычніка 1910 года, казаў:

> Я заклікаю Беларусь да самавызначэння, да нацыянальнага ўсведамлення, да адроджанай будучыні, якая будзе ў руках у беларусаў.

Доўнар-Запольскі, Сапуноў, іншыя гісторыкі левага крыла «западно-руссизма» рабілі ўсё, што было ў іх сілах, каб Беларусь і беларусы занялі пачэсны пасад між краінамі і народамі. А паколькі гэта непатрэбна было ні В. Шчарбакову, ні С. Вальфсону, ні іхняму бальшавіцкаму «начальству», то яны і грамілі, не выбіраючы вельмі слоў і не шукаючы доказаў у пацверджанне сваіх думак усіх, хто ім чымсьці не падабаўся.

Але ж халуйства перад маскоўскімі назначэнцамі не ўратавала Шчарбакова ад сякеры сталінскага тэрору. «Таварышы па партыі» вылучылі яго са сваіх радоў у жніўні 1936 года. Яшчэ праз год, 21 ліпеня 1937, Шчарбакоў быў арыштаваны НКУС БССР, а ў чэрвені 1938 асуджаны да вышэйшай меры пакарання як «удзельнік контррэвалюцыйнай нацыянал-фашысцкай тэрарыстычнай арганізацыі». 29 чэрвеня ён атрымаў ад ката НКУС кулю ў патыліцу.

* * *

У 30-я гады М.Д.З. працаваў ў малавядомым НДІ пушніна-футравай гаспадаркі Наркамата знешняга гандлю СССР, час ад часу чытаў лекцыі ў сельскагаспадарчай акадэміі ім. Цімеразева.

У красавіку 1931 года у Мінску адбыўся аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КПБ(б). У сваім выступленні В. Сербента назваў Доўнар-Запольскага контррэвалюцыянерам і адным з ідэолагаў беларускага нацыяналізму. А артыкул нейкага Ротмана (артыкул падпісаны толькі прозвішчам), апублікаваны ў 1931 годзе ў часопісе «Савецкая краіна», № 7, так і названы — «Афіцыйны гісторык нацдэмаў».

Зноў над галавой Доўнар-Запольскага сабраліся хмары. Выратоўвала толькі тое, што ён жыў у Маскве: тут было не так горача, як у Мінску, дзе мясцовыя ўлады праяўлялі асаблівую пільнасць у барацьбе з «нацыянал-дэмакратамі» і іншымі «ворагамі народа».

Але здароўе было падарвана бесперапыннай працаю, цяжкім жыццём, канфліктамі з сынамі і іх ранняй смерцю, бясконцымі пераездамі, тымі нервовымі перанапружаннямі, якія давялося перанесці у апошнія 15 гадоў жыцця.

30 верасня 1934 года, рыхтуючыся адзначыць імяніны жонкі, якая вярнулася да яго і шмат у чым дапамагала, як бы загладжваючы грахі сваёй маладосці, ён лёг адпачыць, заснуў і больш не прачнуўся. Было яму 67 гадоў. Безумоўна, смерць выратавала вучонага ад непрыемнасцей, якія яго чакалі — арышта і сталінскага гулага...

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Мітрафан Доўнар-Запольскі пакінуў пасля сябе тысячы старонак апублікаваных і нявыдадзеных работ, а таксама добрую памяць у сэрцах тых, хто яго ведаў і любіў.

Яго ўклад у станаўленне беларускай гістарычнай навукі, пераацаніць немагчыма. Ён быў адным з тых першых, хто здолеў кінуць позірк далека за межы свайго часу, заўважыць заканамернасці развіцця беларускай нацыі, хто заклаў тэарэтычны падмурак, на якім грунтавалася яе адраджэнне.

Пяру Доўнара-Запольскага належыць больш за 200 прац па этнаграфіі, сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі Беларусі, Летувы, Украіны і Польшчы. Гэты навуковец стаяў каля вытокаў беларускай археаграфіі і крыніцазнаўства, увёў у навуковы ўжытак вялікую колькасць невядомых дакументаў. Выдадзенымі ім дакументальнымі зборнікамі гісторыкі карыстаюцца амаль цэлае стагоддзе.

Таленавіты даследчык і аўтар, грамадскі і палітычны дзеяч, арганізатар навукі і адукацыі, асветнік, педагог — гэты пералік сведчыць аб яго яскравай індывідуальнасці і магутнасці творчай натуры. Пражыўшы палову жыцця ў XIX стагоддзі, а другую палову — у XX, ён як бы злучыў у сваёй асобе гэтыя два стагоддзі.

Ён адчуў на сабе цяжкі поступ той эпохі, дзе гібель цэлых пакаленняў у войнах і рэвалюцыях спалучалася з нараджэннем новага грамадскага ладу, а чалавечая асоба гублялася за глабальнасцю адбываўшыхся падзей. У гэтых палітычных віхурах М. В. Доўнар-Запольскі застаўся сапраўдным інтэлігентам, захаваў цвёрдасць духу, мужнасць, веру ў перамогу ідэалаў дабра і справядлівасці.

## КНІГІ М. В. ДОЎНАРА-ЗАПОЛЬСКАГА АБ БЕЛАРУСІ

Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель (до конца XII столетия). Киев, 1891.

Белорусское Полесье: Сборник этнографических материалов. Выпуск 1. Киев, 1895.

Западно-русская сельская община в XVI веке. СПб., 1897.

Спорные вопросы по истории Литовско-Русского сейма. СПб., 1901.

Государственное хозяйство Великого княжества Литовского при Ягеллонах. Киев, 1901.

Очерки по организации западно-русского крестьянства в XVI веке. Киев, 1905.

Исследования и статьи. Киев, 1909.

Асновы дзяржаўнасці Беларусі. Гродна, 1919.

Народное хозяйство Белоруссии, 1861—1914. Минск, 1926.

Гісторыя Беларусі. Мінск, 1994.

История Беларуси. Минск, 2003.

## ЗМЕСТ

Уступ ........ 3
Першыя крокі ў навуцы (1884—1889) ........ 3
Кіеўскі універсітэт (1889—1895) ........ 10
Масква (1895—1901) ........ 20
І зноў Кіеў (1901—1918) ........ 24
Віхары рэвалюцыі ........ 32
Няхай жыве БНР! ........ 34
Харкаў — Баку (1919—1925) ........ 42
Мінск (1925—1926) ........ 43
Зноў Масква (1926—1934) ........ 54
Заключэнне ........ 62
Кнігі М. В. Доўнара-Запольскага аб Беларусі ........ 63

Научно-популярное издание

**ТАРАС Анатоль**

**МИТРОФАН ДОВНАР-ЗАПОЛЬСКИЙ**

**ОТЕЦ БЕЛАРУСКОЙ ИСТОРИОГРАФИИ**

Ответственный за выпуск *Ю. Г. Хацкевич*
Подписано в печать 23.11.2012. Формат 70 × 90 $^{1}/_{32}$.
Бумага типографская. Печать офсетная.
Усл. печ. л. 2,0. Уч.-изд. л. 1,74.
Тираж 1500 экз. Заказ 3555.

ООО «Харвест». ЛИ № 02330/0494377 от 16.03.2009.
Ул. Кульман, д. 1, корп. 3, эт. 4, к. 42,
г. Минск, Республика Беларусь.
E-mail: harvest@anitex.by

Республиканское унитарное предприятие
«Издательство «Белорусский Дом печати».
ЛП № 02330/0494179 от 03.04.2009.
Пр. Независимости, 79, 220013, г. Минск, Республика Беларусь.

## АГУЛЬНЫ СПІС ДЛЯ СЕРЫІ
### «100 выдатных дзеячоў беларускай культуры»
(пакуль што у ім 75 асоб, трэба вылучыць яшчэ 25)

**Азгур** З., Александроўская Л., Альхімовіч К., Аляхновіч Ф., Андрыёлі М., Арсеннева Н.

**Багдановіч** М., Багушэвіч Фр., Баршчэўскі Я., Брыль Я., Буйла К., Буйніцкі І., Быкаў В., Бялыніцкі-Біруля В.

**Верас** З., **Галубок** У., Гараўскі А., Гарэцкі М., Геніюш Л., Глебаў Я.

**Доўнар-Запольскі** М., Драздовіч Я., Дубоўка У., Дунін-Марцінкевіч В.

**Ельскі** А., Ермаловіч М., **Ждановіч** Ф.

**Канчэўскі** І., Караткевіч У., Карскі Я., Кастравіцкі К., Кіркор А., Колас Я., Кулік Я., Купала Я.

**Ластоўскі** В., **Манюшка** Ст., Маўр Я., Мележ І., Міцкевіч А., Мулявін У., Мялешка М.

**Нарбут** Т., Насовіч І., Нікіфароўскі М., **Орда** Н.

**Паеўскі** М., Пануцэвіч В., Пашкевіч Э. (Цётка), Пяткун А., **Раманаў** Е.

**Сачанка** Б., Сергіевіч П., Смоліч А., Станкевіч А., Станкевіч Я., Станюта С., Сыракомля У., Сыс А., Сядура У.

**Тарас** В., Ткачоў М., Тураў В., Тэраўскі У., **Уласаў** А., Улашчык М.

**Фальскі** У., **Цвікевіч** А., **Чачот** Я., **Шукевіч** В., Шчакаціхін М., Шырма Р., Шэйн П.

**Эпімах**-Шыпіла Б., **Янчук** М.



ISBN 978-985-20-0219-6

Мітрафан Доўнар-Запольскі (1867—1934) – беларускі гісторык, эканаміст, этнограф, заснавальнік беларускай нацыянальнай школы гісторыяграфіі. Сярод яго шматлікіх навуковых твораў трэба адназначыць «Гісторыю Беларусі», у якой разгледжаны шлях, пройдзены беларускім народам ад эпохі першабытнага ладу да пачатку 1920-х гадоў. Але ў той час яна была забаронена і ўпершыню надрукавана толькі ў 1994 годзе.